ЯК АДХОДЫ ПЕРАТВАРЫЦЬ У ДАХОДЫ

4

НОВЫ ІНТЭРНАТ ДЛЯ СТУДЭНТАЎ-МЕДЫКАЎ

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

10 СТУДЗЕНЯ 2020 г.
ПЯТНІЦА
№ 5 (29119)

9-24 стар.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

+TV ПРАГРАМА

ЛІЧБА ДНЯ

да 500

плануе ў 2021 годзе павялічыць па краіне колькасць электразарадных станцый кампанія «Беларуснафта» — нацыянальны аператар па стварэнні і развіцці сеткі такіх станцый у Беларусі. Летась колькасць ЭЗС у рэспубліцы павялічылася да 250, з іх 54 былі ў 2019-м уведзены ў строй у сталіцы. Сёлета ў Мінску плануецца ўстанавіць каля 150 такіх станцый. Цяпер у мегаполісе дзейнічаюць 85 ЭЗС. Значная частка з іх усталяваная каля аб'ектаў прыцягнення і масавага знаходжання людзей — паркінгаў, гатэляў, гандлёвых і бізнес-цэнтраў, спарткомплексаў.

КАРАТКА

• Для атрымання дазволу на допуск транспартнага сродку да ўдзелу ў дарожным руху больш не патрэбна медыцынская даведка аб стане здароўя.

• Студэнты БДУ распрацавалі тэхналогію разумнага парніка. Сістэма аўтаномна ажыццяўляе паліў і праветрыванне цяпліцы на падставе паказанняў датчыкаў асвятлення, вільготнасці і тэмпературы паветра і глебы.

• «Белавія» пачала продаж білетаў на прамы рэйс у іспанскі Рэус. Самалёты будуць лётаць з 4 чэрвеня двойчы на тыдзень: па чацвяргах і нядзелях.

• БелАЗ, які пайшоў пад ваду ў кар'еры каля Віцебска, дасталі на паверхню.

• Легенда опернай сцэны і адзін з самых уплывовых спевакоў у гісторыі оперы Пласіда Дамінга 19 красавіка выступіць у Мінску.

ISSN 1990 - 763X

Дзеля духоўнасці, Айчыны, незалежнасці

Фота БелТА.

Вялікія справы складаюцца з безлічы малых, дробных, штодзённых спраў і клопатаў. Калі, як гэтыя нашы неспакойныя дні і ночы перарастаюць у трывалы плён, які дае спакой і ўпэўненасць не аднаму чалавеку, а многім людзям, цэламу народу, трываласць цэлай краіне? Напэўна гэта ведаюць тыя, хто ўчора з рук кіраўніка дзяржавы атрымалі дыпломы лаўрэатаў прэміі Прэзідэнта Беларусі «За духоўнае адраджэнне», спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Беларусі дзеячам культуры і мастацтва і спецыяльнай прэміі Прэзідэнта «Беларускі спартыўны Алімп».

СТАР. 2

Прэмію «За духоўнае адраджэнне» атрымліваюць прадстаўнікі грамадскага аб'яднання «Беларуская асацыяцыя шматдзетных бацькоў». Калектыў адзначаны прэміяй за вялікую работу па матэрыяльнай і маральнай падтрымцы шматдзетных сем'яў, рэалізацыю гуманітарных праектаў «Конкурс на найлепшую шматдзетную сям'ю», «Мінскі гарадскі форум маці», тэлепраекта «Родныя людзі».

Парламенцкі дзённік

Менш затрат на летні адпачынак

Візавае пагадненне з ЕС можа ўступіць у сілу 1 чэрвеня

8 студзеня ў Бруселі былі падпісаны пагадненні паміж Беларуссю і Еўрапейскім саюзам аб спрашчэнні выдачы віз і аб рэадмісіі асоб, якія прыбываюць без дазволу. Учора, 9 студзеня, з гэтай нагоды перад прадстаўнікамі СМІ выступіў старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па міжнародных справах Андрэй САВІНЫХ.

«Парламентарыі Рэспублікі Беларусь заяўляюць аб сваёй гатоўнасці ратыфікаваць гэтае Пагадненне ў прыярытэтным парадку на найбліжэйшай вясновай сесіі парламента для яго хутчэйшага ўступлення ў сілу, — заявіў дэпутат. — Мы заклікаем нашых калег з Еўрапейскага парламента з іх боку таксама надаць гэтаму працэсу незваротны характар».

Згодна з Канстытуцыяй Беларусі, другая сесія парламента адкрыецца 2 красавіка. Ужо ў гэты дзень цалкам верагодная ратыфікацыя дакумента ў ніжняй палаце, пасля чаго дакумент будзе разгледжаны сенатарамі і паступіць на подпіс кіраўніку дзяржавы. «Мы зробім тое максімальна хутка, — сказаў Андрэй Савіных. — Наша мэта завяршыць гэта да канца красавіка».

Згодна з Пагадненнем, новыя правілы атрымання віз пачнуць дзейнічаць у першы дзень другога месяца пасля даты паведамлення бакамі адзін аднаму аб завяршэнні працэдур ратыфікацыі. Гэта значыць, найбольш верагодная найбліжэйшая дата — 1 чэрвеня.

«Пастаянная камісія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах вітае падпісанне Пагадненне паміж Беларуссю і Еўрапейскім саюзам аб спрашчэнні паездак грамадзян, — паведаміў Андрэй Савіных. — Мы ўпэўненыя, што гэтае пагадненне будзе садзейнічаць палягчэнню паездак грамадзян, развіццю міжнародных, у тым ліку турыстычных кантактаў, а таксама ўмацаванню атмасферы даверу і ўзаемаразумення паміж народамі».

Дакументы ад беларускага боку падпісаў міністр замежных спраў Уладзімір Макей, ад Еўрасаюза — намеснік прэм'ер-міністра — міністр унутраных спраў Харватыі Давар Бажынавіч (Харватыя цяпер старшынствуе ў Еўрапейскім савеце) і еўрапейскі камісар па ўнутраных справах Ільва Ёхансан.

СТАР. 3

Дзеля духоўнасці, Айчыны, незалежнасці

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Аляксандр Лукашэнка традыцыйна звярнуўся да ўдзельнікаў цырымоніі спачатку на беларускай мове.

Ідэя служэння грамадству

«Уручэнне прэміі «За духоўнае адраджэнне» — выдатная традыцыя, якая надае калядным святам асаблівы сэнс, — сказаў ён. — Гэты вечар мы прысвячаем нашым суайчыннікам — тым, хто зберагае і ўзбагачае нацыянальную культуру Беларусі, штогод здзіўляе нас неверагоднымі дасягненнямі. Высокія імкненні людзей, якія зараз падымуцца на гэтую сцэну, не суадносяцца з канонамі сучаснага прагматычнага свету, дзе ўсё прадаецца і купляецца, а мараль і справядлівасць не каштуюць нічога».

Прэзідэнт адзначыў, што вялікую ідэю служэння грамадству і дзяржаве намінанты прэміі «За духоўнае адраджэнне» ставяць вышэй за матэрыяльныя выгоды. Сваімі справамі і ўчынкамі яны замацоўваюць у нашых сэрцах веру ў дабро і чысціню думак.

«Такі прыклад выклікае пачуццё гордасці за наш народ, які захаваў найлепшыя нацыянальныя рысы: спагадлівасць і велікадушнасць, працавітасць і мэтанакіраванасць, сапраўдны патрыятызм, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — Дзякуючы героям гэтага святочнага вечара цеплыню і пяшчоту адчулі многія беларускія дзеці, якія засталіся без бацькоўскага клопату і любові. Знайшлі спачуванне і падтрымку людзі, якія сутыкнуліся з цяжкай хваробай, апынуліся ў складанай жыццёвай сітуацыі».

«Сімвалічна, што напярэдадні 75-годдзя Вялікай Перамогі мы ўручым прэмію «За духоўнае адраджэнне» Беларускаму грамадскаму аб'яднанню ветэранаў, — дадаў Прэзідэнт. — Адзначым іх унёсак у захаванне памяці аб подзвігу народа і актыўную гуманітарную дзейнасць».

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Беларускі лідар выказаў пажаданне, каб традыцыйная прэмія «Беларускі спартыўны Алімп» натхніла айчынных спартсменаў на новыя здзяйсненні на будучых Гульнях у алімпійскім Токіа.

Памяць і вернасць

Прэзідэнт перакананы, што наша незалежная дзяржава створана ў тым ліку дзякуючы памяці аб сваіх вытоках і вернасці зямлі сваіх продкаў. «Мы і надалей будзем падтрымліваць і заахвочваць усіх, хто ўзбагачае культурную спадчыну Беларусі, беражэ маральныя і духоўныя арыенціры, адраджае і напаўняе новым сэнсам нацыянальныя традыцыі», — адзначыў беларускі лідар і назваў такіх творцаў якарам, які дапаможа ўтрымацца на хвалі глабалізацыі, нацэленай на разбурэнне дзяржаўных асноў.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што мы адкрытыя для дружбы і ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва, але наш традыцыйны сацыяльна арыентаваны ўклад непахісны. «Толькі так, памятаючы, хто мы і ў чым наша ўнікальнасць, захоўваючы сваю ідэнтычнасць і самабытнасць, мы зможам супрацьстаяць ідэі ўніфікацыі свету пад адзіны, чужы нашаму менталітэту ўзор ці стандарт. Ствараючы духоўную, маральную і культурную асновы для жыцця будучых пакаленняў беларусаў, мы таксама забяспечваем нацыянальную бяспеку і ўмацоўваем суверэнітэт краіны», — сказаў ён.

Стварэнне моцнай, незалежнай дзяржавы — заслуга ўсяго беларускага народа, але асаблівая роля належыць тым, хто прысвяціў сябе бескарыслівому служэнню сваёй Айчыне.

Краіну стварае народ

Аляксандр Лукашэнка закрануў і надзённыя тэмы жыцця краіны. Ён нагадаў, што зараз вельмі часта кажа аб суверэнітэце і незалежнасці. У тым ліку і таму, што яшчэ ніколі наш народ не меў магчымасці без крыві, з нуля, на рэштках вялікай краіны пабудаваць незалежную дзяржаву. І мы не маем права не скарыстацца гэтай унікальнай магчымасцю.

Ён адзначыў, што нашу дзяржаву сёння мы будуем не толькі для сябе, але для сваіх дзяцей. Аднак час сёння няпросты. «Я не апраўдваюся і тым больш нікога не баюся. Я проста хачу папярэдзіць вас усіх — зараз вельмі востры перыяд існавання нашай дзяржавы. Мы ідзём не проста па тонкім лёдзе ці па лязе. Мы ідзём і хістаемся злева направа. І не дай бог, недакладны ці няправільны крок — і мы страцім усё», — сказаў кіраўнік краіны.

Каб пазбегнуць непапраўнага, неабходна супыніць «блуканне па мірных, спакойных, чыстых вуліцах» і размовы аб здрадах, аб здачы Беларусі. «Можа, хтосьці гэтага (здачы. — **Зв.**) і хоча, але не першы Прэзідэнт, які гэту краіну будаваў», — удакладніў лідар дзяржавы.

Не нафтай адзінай

Кіраўнік дзяржавы папрасіў нацэліцца на будучыню і падкрэсліў, што не нафта або газ — галоўнае ў сённяшніх адносінах Беларусі і Расіі.

«Чаму мы да гэтага часу з Прэзідэнтам Расіі не дамовіліся па нафце? Ды таму, што Расія хоча, каб мы купілі ў яе нафту па цане вышэй за сусветную. Дзе такое бачна? Таму я і адмовіўся ад такой нафты і шчыра заявіў, калі не будзе паставак па сусветнай цане з Расіі нафты, мы знойдзем гэту нафту ў іншым месцы, што мы і робім», — расказаў Прэзідэнт.

Простая пазіцыя кіраўніка краіны і па газе. Па словах Аляксандра Лукашэнкі, «Газпрам» сёння зарабляе на Беларусі ў тры разы больш, чым на Германіі. «Мы дамовіліся на сёння, што гэтыя два месяцы, пакуль мы не дамовімся, гэта была прапанова Прэзідэнта Пуціна, будзем працаваць па газе на ўмовах 2019 года. Але я нагадаў, калі мы ішлі на продаж «Белтрансгаза» (гэта было ў 2011 годзе), была жорсткая дамоўленасць, што за пяць гадоў мы выйдзем на расійскую цану па газе. Хтосьці гэта забыў, я помню. І я настойваю, каб гэта было рэалізавана», — паведаміў Аляксандр Лукашэнка.

Ён адзначыў: у больш зручны час падрабязна раскажа грамадскасці пра тое, што адбываецца ў свеце, і ў прыватнасці, пра адносіны з Расіяй.

«Але вы павінны памятаць: няма больш у свеце народа, які б з такой павагай і хваляваннем адносіўся да беларусаў, як расіяне. Па-рознаму могуць устройвацца скокі, свістапляскі і ісці перагаворы паміж кіраўніцтвам краін і элітай, але трэба глядзець глыбей. Расіяне — нашы браты, якія заўсёды гатовыя падставіць нам плячо ў складаную хвіліну», — звярнуў увагу Прэзідэнт Беларусі і запэўніў, што няма катастрофы, калі мы не дамовімся з Расіяй.

Але нават у гэтай сітуацыі жыць будзем не горш, чым летась. «Мы сталі на ногі дзякуючы сваёй працы», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Сусветныя спецыялісты і аналітыкі ацэньваюць беларусаў як адукаваных, працавітых людзей. Сёння, па словах Прэзідэнта, пэўныя сілы жадаюць сутыкнуць беларусаў і расіян, але нашы адносіны — паказчык таго, як павінны развівацца сувязі.

Марыя ДАДАЛКА, Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

«БАГАЦЦЕ БЕЛАРУСІ МУСІЦЬ ПРЫРАСТАЦЬ ІНТЭЛЕКТАМ»

Сярод тых, хто адзначаны высокай прэміяй «За духоўнае адраджэнне» па выніках 2019 года — аўтарскі калектыў у складзе акадэміка-сакратара аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі Аляксандра Кавалені, галоўнага рэдактара РУП «Белкартаграфія» Галіны Ляхавай, дырэктара ДУ «Беларускі навукова-даследчы цэнтр электроннай дакументацыі» Вячаслава Насевіча. Узнагарода ім прысуджана за стварэнне фундаментальнага картаграфічнага выдання «Вялікі гістарычны атлас Беларусі».

Доктар гістарычных навук, прафесар, член-карэспандэнт НАН Беларусі Аляксандр КАВАЛЕНЯ, які, дарэчы, нядаўна быў прызнаны калегамі «Навукоўцам года Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі — 2019», згадвае, што напачатку аб'ём маштабнай працы не да канца ўяўлялі нават самі вучоныя — так, планавалася, што «Вялікі гістарычны атлас» змесціцца ў трох тамах, а атрымаліся чатыры, і сёлета ўжо гатовы да выхаду пяты, падагульняльны том. Наогул жа на стварэнне атласа спатрэбілася больш чым 10 гадоў!

«Яшчэ ў 2005 годзе, калі мяне толькі прызначылі дырэктарам Інстытута гісторыі, да нас звярнуўся мой настаўнік, прафесар Леў Раманавіч Казлоў з прапановай выдання шэрагу гістарычных картаў, на якіх адлюстраваныя падзеі, што адбываліся на беларускіх землях, — расказвае Аляксандр Каваленя. — У ходзе абмеркавання мы выйшлі на ідэю магчымасці падрыхтоўкі і стварэння гістарычнага атласа суверэннай Беларусі».

Па словах Аляксандра Аляксандравіча, складанасцяў у гэтай рабоце не адчувалася, бо аб'ектыўна збегліся спрыяльныя абставіны, «якраз супалі тры падзеі: нацыянальная дзяржаўная самастойнасць Беларусі, магчымасці сучасных камп'ютарных тэхналогій і вялізны навуковы матэрыял, назапашаны вучонымі Інстытута гісторыі». Прапанову па стварэнні гістарычнага атласа як надзвычай значнага палітычнага і гісторыка-культурнага праекта падтрымалі ў Прэзідыуме Акадэміі навук, Дзяржаўным камітэце па маёмасці і Дзяржаўным камітэце па архівах і справаводстве — агульнымі намаганнямі гэтага трыумвірату справа і перайшла з ідэі ў практыку. У падрыхтоўцы выдання ўдзельнічала не толькі вялікая група навукоўцаў — гісторыкаў і лінгвістаў з Нацыянальнай акадэміі навук і вядучых ВНУ краіны, але таксама архівісты, мастакі, спецыялісты прадпрыемства «Белкартаграфія». Дзякуючы апошнім, дарэчы, некаторыя карты ўдалося стварыць наўпрост з чыстага ліста, захоўваючы пры гэтым аб'ектыўнасць падачы матэрыялу, узаемасувязь і дынаміку тых ці іншых падзей.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Шырокая грамадскасць, натуральна, не заўважыла падводных камянёў, якімі суправаджалася гэтая няпростая праца — напрыклад, часта падрыхтаваныя карты атрымлівалі супярэчлівыя і нават супрацьлеглыя рэцэнзіі, іх даводзілася шмат разоў узгадняць і знаходзіць навукова абгрунтаваныя рашэнні. Але вынік быў таго варты — у чатырох тамах «Вялікага гістарычнага атласа Беларусі» сабрана больш чым 400 унікальных картаў, кожная з якіх мае асновай арыгінальныя крыніцы, у тым ліку прадстаўлены буйнамаштабныя карты асобных тэрыторый, планы гарадоў, схемы знакавых бітваў. Кожны том атласа дапаўняюць генеральныя карты, на якіх паказаныя ўсе больш-менш значныя населеныя пункты адпаведнага часу з абазначэннем іх прыналежнасці. Геаграфічны паказальнік утрымлівае гістарычныя і сучасныя назвы ўсіх населеных пунктаў, размешчаных на генеральнай карце, з прыналежнасцю іх да паветаў і маёнткаў, часам першай згадкі ў крыніцах, варыянтамі і зменамі назваў... Дзякуючы прафесійнай, карпатлівай і зладжанай працы вучоных і картографаў першы том атласа ўбачыў свет ужо ў 2009 годзе, чацвёрты — у кастрычніку 2018 года. Цяпер найлепшыя карты і выніковая інфармацыя сабраныя ў асобным, падагульняльным томе «Вялікага гістарычнага атласа».

Цяжка пераацаніць значнасць праекта для навуковага і культурнага жыцця Беларусі. Справа нават не ў тым, што падобнага выдання няма ў краінах СНД і нават Еўропы. У гэтым выданні абагульнены вопыт гісторыі Беларусі, які раскрывае цэласную, аб'ектыўную гісторыю нашай краіны і з'яўляецца яе візітоўкай у дадатак да галоўных сімвалаў — герба, сцяга і гімна. Прымаючы віншаванні з высокай узнагародай, прафесар Аляксандр Каваленя пагаджаецца: аўтарскаму калектыву насамрэч ёсць чым ганарыцца. «Мы паказалі і даказалі ўсяму свету, а найперш самі сабе, што беларусы не проста «паны сахі і касы», якімі мы сябе лічым, а народ з багатай гісторыяй, культурай і традыцыямі, які ўмее адказваць на выклікі часу, што мы — нацыя, здольная жыць і працаваць у вянку еўрапейскіх народаў і быць шмат у чым прыкладам для іншых. Такія працы, як «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці», як «Вялікі гістарычны атлас Беларусі», дазваляюць гаварыць аб тым, што мы высокаінтэлектуальны народ і што нашы навукоўцы здольныя вырашаць самыя складаныя задачы... У свой час Міхайла Ламаносаў гаварыў: «Багацце Расіі Сібіру прырастаць будзе», а сёння мы мусім прасоўваць у нашым грамадстве ідэю, што багацце Беларусі інтэлектам нацыі прырастаць будзе. Бо выжыць мы сёння можам, толькі захоўваючы гэтую аснову — настаўнік, школа, ВНУ, фундаментальная адукацыя і навука, — якая развівае інтэлектуальны рэсурс беларускага народа».

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Аб іншых лаўрэатах прэміі «За духоўнае адраджэнне» мы раскажам у наступных нумарах.

ГАЛОЎНЫ СТАРТ ДЛЯ МАЛАДЫХ

III зімовыя юнацкія Алімпійскія гульні ў Лазане стартавалі яркай цырымоніяй адкрыцця на Vaudoise Arena

Маляўнічае шоу расказала пра культуру і традыцыі Швейцарыі, а ўпрыгожаннем цырымоніі стаў парад атлетаў і запальванне алімпійскага агню, які завяршыў сваё падарожжа па альпійскай краіне.

Беларуская каманда па лыжных гонках, якая выступіць у Лазане.

У спаборніцтвах, якія праводзяцца пад эгідай Міжнароднага алімпійскага камітэта, прыме ўдзел роўная колькасць юнакоў і дзяўчат — 1880 спартсменаў больш чым з 70 краін, якія будуць змагацца за медалі ў васьмі відах спорту ў 16 дысцыплінах: біятлоне, бабслеі, кёрлінгу, хакеі з шайбай, санным спорце, фігурным катанні, канькабежным спорце, шорт-трэку, скелетоне, фрыстайле, горных лыжах, скачках з трамплiна, лыжных гонках, скі-альпінізме, лыжным дваяборстве і снаўбордынгу.

Беларуская дэлегацыя ў Лазане будзе прадстаўлена ў пяці відах спорту: біятлон (3 юнакі і 3 дзяўчыны), гарналыжны спорт (1 юнак), канькабежны спорт (2 юнакі і 2 дзяўчыны), лыжныя гонкі (2 юнакі і 2 дзяўчыны), хакей з шайбай — турнір 3х3 (4 юнакі).

Талісманам Гульняў абраны Ёдлі — фантастычны звярок, які ўяўляе сабой сумесь каровы, казы і сабакі пароды сенбернар — жывёл, распаўсюджаных у Швейцарыі.

Нагадаем, юнацкія Алімпійскія гульні праводзяцца МАКам раз у чатыры гады. Першыя зімовыя Гульні для юных спартсменаў адбыліся ў 2012 годзе ў аўстрыйскім Інсбруку, а ў 2016-м галоўныя старты маладых атлетаў прымаў нарвежскі Лілехамер.

III юнацкія зімовыя Алімпійскія гульні завершацца 22 студзеня.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

Надвор'е

НА ДВАРЫ СТУДЗЕНЬ?

А больш нагадвае канец лістапада

Чарговыя выхадныя будуць у нас зноў цёплыя. Але на вуліцы дастаткова няўтульна, таму што ветрана, вільготна і золка, паведамляюць нам спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Уночы ў суботу надвор'ем будзе кіраваць атмасферны фронт, а ўдзень улада пяройдзе да тылавой часткі цыклону, які змяшчаецца з поўдня Балтыйскага мора на цэнтральныя раёны еўрапейскай часткі Расіі. Чакаецца воблачнае, удзень з праясненнямі, надвор'е. Уначы часам ападкі, па Віцебскай вобласці ў асобных раёнах моцныя дажджы і мокры снег. Удзень на большай частцы тэрыторыі краіны кароткачасовыя ападкі, у асноўным дождж. Вецер заходні і парывісты. Тэмпература паветра на працягу сутак ад нуля да плюс 6 градусаў.

У нядзелю надвор'е значна палепшыцца. Гэта адбудзецца, таму што яно ў асноўным будзе фарміравацца ў вобласці павышанага атмасфернага ціску, толькі ў паўночных раёнах адаб'ецца ўплыў малаактыўнага атмасфернага фронту. Будзе воблачна з праясненнямі, пераважна без ападкаў, толькі месцамі па поўначы Беларусі пройдуць невялікія кароткачасовыя дождж і мокры снег. Уначы і раніцай у асобных раёнах слабыя туман і галалёд, на дарогах галалёдзіца. Вецер паўднёва-заходні парывісты, у дзённыя гадзіны ў паўночных раёнах месцамі моцны парывісты. Мінімальная тэмпература паветра ўначы будзе ад мінус 5 градусаў да плюс 2 градусаў, а максімальная днём — ад нуля да 6 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у панядзелак і аўторак умовы надвор'я будуць вызначаць франтальныя раздзелы і паветраныя масы атлантычнага паходжання. Удзень будзе ад нуля да 5 цяпла, а ўначы ад плюс 2 градусаў да 3 градусаў марозу.

Сяргей КУРКАЧ.

Сталічная нерухомасць

Гараж коштам амаль 1,5 млн рублёў

Самым паспяховым аўкцыёнам мінулага года па продажы невыкарыстоўваемай сталічнай дзяржуласнасці стала рэалізацыя крытага гаража ў адным з завулкаў горада

Усяго, як паведамілі ў камітэце «Мінскгармаёмасць», летась у галоўным мегаполісе было прададзена дзяржаўных аб'ектаў на агульную суму 3 млн 997 тысяч рублёў.

Камітэт таксама склаў рэйтынг выніковасці праведзеных аўкцыёнаў. У выніку была вызначана пяцёрка лідзіруючых продажаў з арганізаваных 52 аўкцыёнаў па рэалізацыі 23 дзяржаб'ектаў нерухомасці.

Самым паспяховым аказаўся адзін з апошніх, праведзены 24 снежня мінулага года. У гэты дзень за 1 млн 431 тысячу 141 рубель 39 капеек быў прададзены будынак крытага гаража на 350 аўтамабіляў у завулку Альшэўскага, агульнай плошчай 13 659,3 квадратнага метра. Новы гаспадар павінен будзе захаваць на працягу года функцыянальнае прызначэнне аб'екта як спецыялізаванага будынка аўтамабільнага транспарту.

На другім месцы — аб'екты рэспубліканскай уласнасці, размешчаныя на вуліцы Каржанеўскага (агульная плошча — звыш 13 тысяч квадратных метраў). На ліпеньскім аўкцыёне пачатковы кошт незавершаных кансерваваных капітальных будынкаў быў роўны шасці базавым велічыням. А ў выніку таргоў канчатковая цана ўзрасла больш чым у шэсць тысяч (!) разоў. Такім чынам маёмасць была прададзеная юрыдычнай асобе за 1,02 млн рублёў. Дарэчы, у адпаведнасці з горадабудаўнічым праектам дэталёвага планавання тэрыторыя зямельнага ўчастка (1,8573 га), на якім размешчана нерухомасць, прадугледжана пад інвестыцыйную пляцоўку вытворчага прызначэння.

Трэцяе месца — у неэфектыўна выкарыстоўваемай вытворчай базы ДВА «Мінскбуд» на вуліцы Казінца. 17 снежня мінулага года комплекс з пяці будынкаў агульнай плошчай 718,4 квадратнага метра сышоў з малатка з першай жа спробы за 400 тысяч 8 рублёў. Функцыянальнае прызначэнне нерухомасці самае шырокае: тут можна размясціць аб'екты грамадскага, адміністрацыйна-дзелавога прызначэння, сферы абслугоўвання насельніцтва, навучальныя і праектныя арганізацыі, прадпрыемствы гандлю і грамадскага харчавання, установы навукі, культуры, аховы здароўя і спорту.

Фота БелТА.

Чацвёртае месца сярод самых удалых аўкцыёнаў заняў продаж аб'екта рэспубліканскай уласнасці на вуліцы Аўтамабілістаў. У верасні адзіны ўдзельнік таргоў заплаціў за яго больш за 312 тысяч рублёў.

Замыкае пяцёрку самай дарагой нерухомасці былы дзіцячы сад на вуліцы Амельянюка. У кастрычніку ён таксама быў прададзены адзінаму ўдзельніку аўкцыёну за 196 тысяч 893 рублі 88 капеек. Галоўная ўмова, якую павінен выканаць пакупнік, гэта тое, што ў будучыні ў будынку павінна працаваць установа адукацыі.

Што датычыцца ізаляваных памяшканняў, то ў 2019 годзе было прададзена 11 такіх аб'ектаў нерухомасці. Самым дарагім стала буйное падвальнае памяшканне на вуліцы Сувязістаў агульнай плошчай 433 квадратныя метры. Памяшканне было прададзена ў кастрычніку за 157 тысяч 920 рублёў. Сапраўды — кожнаму сваё. Каму гараж за 715 тысяч долараў, а камусьці падвал за 80 тысяч «зялёных». Дробязь, праўда?

Сяргей КУРКАЧ.

Менш затрат на летні адпачынак

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Перамовы аб спрашчэнні выдачы віз паміж Беларуссю і ЕС вяліся з 2014 года. Як паведаміў Давар Бажынавіч, у 2018 годзе амаль 700 тысяч беларусаў падалі заяўкі на атрыманне шэнгенскай візы, больш за 80 % выдадзеных віз былі шматразовыя. «Беларусь — краіна з адным з самых высокіх паказчыкаў выдадзеных шэнгенскіх віз і з адным з найменшых адсоткаў адмоў», — звярнуў ён увагу.

Візавае пагадненне з ЕС прадугледжвае ўзаемнае палягчэнне візавых працэдур для шырокай катэгорыі грамадзян і зніжэнне збору. Пры гэтым будзе забяспечана права грамадзян звяртацца дзеля атрымання віз як у пасольствы еўрапейскіх краін, так і ў візавыя цэнтры.

Кошт «шэнгена» для беларусаў знізіцца да 35 еўра, а рашэнне аб выдачы візы будзе прымацца ў тэрмін да 10 дзён (у выпадку дадатковай праверкі тэрмін можа павялічыцца да 30 дзён). Многія катэгорыі грамадзян у залежнасці ад мэты паездкі змогуць звяртацца па візу без выплаты збору і атрымліваць шматразовыя візы з больш доўгім тэрмінам дзеяння ў спрошчаным парадку.

Беларуская віза для грамадзян ЕС таксама патаннее да 35 еўра. Акрамя таго, будзе павялічаны пералік падстаў для выдачы бясплатных віз у некамерцыйных мэтах. Тэрмін знаходжання замежнікаў у Беларусі павялічыцца ў два разы: з 90 дзён у годзе (цяпер) да 180.

У пачатку лютага пачне дзейнічаць абноўлены Візавы кодэкс Еўрапейскага саюза, які прадугледжвае павышэнне кошту візавага збору да 80 еўра. Для беларусаў гэтая цана будзе дзейнічаць да таго часу, пакуль не ўступіць у сілу пагадненне з ЕС. Толькі пасля гэтага збор аўтаматычна знізіцца з 80 да 35 еўра.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Эксперты прагназуюць сёлета запаволенне росту сусветнай эканомікі



У 2020 годзе тэмпы росту сусветнай эканомікі запаволяцца пры захаванні інтэграцыі і эканамічнага развіцця. Пра гэта гаворыцца ў прагнозе кансалтынгавага агенцтва PwC, агляд якога прыводзіць РБК. Як лічаць у PwC, сёлета сусветная эканоміка вырасце на 3,4 працэнта ў парытэце пакупной здольнасці. За мінулыя гады XXI стагоддзя сяроднегадавая велічыня гэтага паказчыка складала 3,8 працэнта. Таксама ў прагнозе адзначаецца, што ў сусветным гандлі паўстануць складанасці ў пытанні «паставак і далейшай эканамічнай інтэграцыі ў маштабах усяго свету». «Крыніцай аптымізму» аналітыкі назвалі сферу паслуг — паказчык экспарту ў гэтай галіне ў свеце па выніках года можа дасягнуць 7 трыльёнаў долараў. «Адбываецца глабальнае запаволенне росту эканомікі («слоўбалізацыя»), якое характарызуецца працягам інтэграцыі і эканамічнага развіцця, але больш павольнымі тэмпамі, ніжэй сярэдніх», — адзначыў старшы эканаміст PwC Барэт Купелян. У PwC таксама лічаць, што сёлета ў свеце з'явяцца мільёны новых рабочых месцаў. Так, краіны «Вялікай сямёркі» павялічаць іх колькасць на 2 млн, а, згодна з прагнозам Міжнароднай арганізацыі працы (структура ААН), у сямі найбуйнейшых краінах з эканомікай, якая развіваецца, уключаючы Кітай і Расію, з'явіцца яшчэ 8 млн вакансій.

Названы самыя «моцныя» пашпарты ў свеце

Пашпарт Японіі прызнаны самым «моцным» у свеце: грамадзяне гэтай дзяржавы могуць без візы пабываць у 191 краіне. На другім месцы — Сінгапур, яго жыхары могуць, не думаючы пра візу, з'ездзіць у 190 краін. На трэцім месцы — нямецкі і паўднёвакарэйскі пашпарты (189 дзяржаў). Сярод постсавецкіх краін самым «магутным» пашпартам могуць пахваліцца жыхары Літвы (бязвіз у 181 краіну), а таксама Латвіі (180) і Эстоніі (179). Украіна — на 41-м месцы (128 дзяржаў), Малдова — на 49-м (120), Грузія — на 53-м (116). Расія падзяляе 51-ы радок з Мікранезіяй, іх жыхарам віза не патрэбна ў 118 краін. Казахстан — на 67-м месцы (76 дзяржаў), Беларусь — на 68-м (75 краін). Самымі «слабымі» апынуліся пашпарты Сірыі, Ірака і Афганістана: для іх грамадзян бязвізавы ўезд адкрыты толькі ў 29, 28 і 26 краін адпаведна.

Тэлескоп «Хабл» сфатаграфаваў «галактыку-Гадзілу»

Касмічны тэлескоп «Хабл» сфатаграфаваў гіганцкую спіральную галактыку, якая мае ўсе шанцы апынуцца самай буйной з усіх вядомых астраномам. Прынамсі, у радыусе мільярда светлавых гадоў ад Зямлі. Афіцыйна галактыка, размешчаная ў сузор'і Персея, вядомая навукоўцам як UGC 2885, але англамоўныя СМІ ўжо ахрысцілі яе «Гадзілай» — за велічэзны памер. Яна раскінулася амаль на паўмільёна светлавых гадоў, гэта значыць у 2,5 раза шырэйшая за наш Млечны шлях, а зорак у ёй прыкладна ў 10 разоў больш. Акрамя таго, як і фантастычны монстр, які быццам бы спіць на дне мора, UGC 2885 размешчана так далёка ад сваіх бліжэйшых суседзяў, што навукоўцы дагэтуль абмяркоўваюць версіі аб тым, як гіганцкай галактыцы ўдалося расчысціць вакол сябе такую прастору.

Навука

ВЫСОКАЯ АЦЭНКА

У топ-10 трапілі фізікі, хімікі, біёлагі, гісторыкі...

Бюро Прэзідыума НАН Беларусі агучыла топ-10 дасягненняў акадэмічных вучоных у галіне фундаментальных і прыкладных даследаванняў.

У дзясятку, у прыватнасці, увайшла распрацоўка высокаадчувальнага метаду распазнавання паталагічных клетак чалавека з выкарыстаннем біясэнсараў на аснове фатонных наноструктур аксіду цынку для дыягностыкі анкагематалагічных захворванняў (над ёй працавалі навукоўцы Інстытута біяфізікі і клетачнай інжынерыі НАН Беларусі).

А распрацоўка калектыву вучоных Інстытута біяарганічнай хіміі была скіравана на стварэнне новага пакалення арыгінальных лекавых сродкаў, якія будуць спрыяць падаўленню пухлінных клетак.

Высокую ацэнку атрымала таксама работа аўтарскага калектыву Інстытута хіміі новых матэрыялаў НАН Беларусі і Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта — стварэнне біясумяшчальных порыстых матэрыялаў на пекцінах з зададзенымі фізіка-хімічнымі ўласцівасцямі і рэгуляванай хуткасцю біядэградацыі для трансплантацыі мезенхімальных ствалавых клетак.

У Інстытуце прыродакарыстання НАН былі ўстаноўлены бягучыя і доўгатэрміновыя трансфармацыі гідратэрмічнага рэжыму ў заходняй частцы Усходне-Еўрапейскай раўніны ў сувязі з глабальнымі змяненнямі клімату.

У Навукова-практычным цэнтры НАН Беларусі па біярэсурсах даследавалі генетычную гісторыю вялікага падворліка і ўстанавілі, што крытычнае падзенне колькасці віду ў пасляледавіковы перыяд на тэрыторыі Еўропы з'яўляецца вынікам уздзеяння неспрыяльных фактараў асяроддзя і не звязана са скарачэннем генафонду.

Аўтарскі калектыў навукоўцаў Інстытута радыебіялогіі НАН Беларусі і Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта трапіў у топ-10 з унікальным эксперыментам па выяўленні ўстойлівай залежнасці рэпрадуктыўнай здольнасці пацукоў-самцоў і іх шматлікіх наступных пакаленняў ад электрамагнітнага выпраменьвання мабільных прылад.

Калектыў аўтараў Навукова-практычнага цэнтра НАН Беларусі па харчаванні аказаўся ў дзясятцы за выяўленне маркераў прысутнасці ў харчовых прадуктах пальмавага алею і яго фракцый, якія дазваляюць гарантаваць бяспеку і якасць прадуктаў харчавання. А навукоўцы Інстытута гісторыі НАН Беларусі — за распрацоўку арыгінальнай канцэпцыі гісторыі беларускай дзяржаўнасці.

Узнагароджанне пераможцаў будзе прымеркавана да святкавання Дня беларускай навукі.

Надзея НІКАЛАЕВА.

На шляху да Мэт

ЯК ПЕРАТВАРЫЦЬ АДХОДЫ Ў ЭНЕРГІЮ

У Мінску плануюць рэалізаваць праект па энергетычнай утылізацыі цвёрдых бытавых адходаў

У сталіцы штогод утвараецца звыш 880 тысяч тон смецця. Прыблізна 500 тысяч тон з іх у далейшым трэба кампаставаць, захаваць альбо выкарыстоўваць у энергетыцы. Магутнасць дзеючых цяпер сартавальных ліній дазваляе перапрацаваць не больш за 150 тысяч тон адходаў. А як выкарыстаць астатнія? Можа, мэтазгодна іх спальваць? Пра гэта ішла гаворка ў грамадскім прэс-цэнтры Дома прэсы, у якой узялі ўдзел спецыялісты розных ведамстваў.

Нетрадыцыйны энерганосьбіт

«Кіраўніком дзяржавы было дадзена даручэнне аб тым, каб Мінэнергетыкі сумесна з усімі зацікаўленымі, у тым ліку гарадскімі ўладамі, Міністэрствам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, Міністэрствам жыллёва-камунальнай гаспадаркі і іншымі, прапрацавала пытанне рэалізацыі пілотнага праекта па энергетычным выкарыстанні цвёрдых камунальных адходаў, — паведаміла **намеснік міністра энергетыкі Вольга ПРУДНІКАВА.** — Пытанне складанае, шматграннае. Патрабуе пэўнага часу для таго, каб яго комплексна вывучыць і прыняць абгрунтаваныя рашэнні».

Цяпер створана рабочая група, у якую ўвайшлі прадстаўнікі названых ведамстваў. Па словах Вольгі Прудніка вай, адным з асноўных кірункаў работы па абыходжанні з адходамі з'яўляецца рэцыклінг. У прыватнасці, адходы можна разглядаць як «не зусім традыцыйныя віды энерганосьбітаў для нашай энергетыкі». Гэта значыць, плануецца выкарыстоўваць іх для вытворчасці цеплавой энергіі. Спальванне цвёрдых бытавых адходаў на ЦЭЦ — вядомы сусветны вопыт. Такі спосаб здабычы энерганосьбітаў не залежыць ад прыродных умоў, у адрозненне ад ветракоў.

Пляцоўкай для такога пілотнага праекта папярэдне абрана Мінская ЦЭЦ-4. Цяпер распрацоўваецца перадпраектная дакументацыя, якая прадугледжвае тры схемы работы на ЦЭЦ з улікам ацэнкі ўздзеяння на навакольнае асяроддзе. Да таго ж у нашай краіне ёсць вопыт выкарыстання адходаў вытворчасці ў якасці энерганосьбіта.

«На Бабруйскай ЦЭЦ-1 быў рэалізаваны праект па выкарыстанні ў якасці паліва адходаў гідролізнай вытворчасці, — нагадала намеснік міністра. — Мы маем вопыт, бачым тыя праблемы, якія могуць узнікнуць. Мы ўжо падрыхтавалі дакументы для грамадскіх абмеркаванняў, цяпер праводзяцца працэдуры па падрыхтоўцы гэтых мерапрыемстваў». Дату грамадскага абмеркавання праекта павінны вызначыць гарадскія ўлады. Тэрытарыяльна ЦЭЦ-4 знаходзіцца ў Фрунзенскім раёне сталіцы.

Абнавіць традыцыйныя схемы

Па словах **намесніка генеральнага дырэктара па эксплуатацыі жыллёвага фонду і вытворчых пытаннях ГА «Мінская гарадская жыллёвая гаспадарка» Цімафея КРЭМЕЗА,** цяпер распрацоўваецца схема абыходжання з адходамі, якая дазволіць вызначыць правільную лагістыку: як лепш ажыццяўляць збор, перавозку і сартаванне адходаў, як размясціць кантэйнерныя пляцоўкі з мэтай забеспячэння максімальнага сартавання.

Акрамя таго, заключаны дагавор з «Белжылпраектам» для правядзення аналізу марфалагічнага складу ЦБА: колькі ў іх пластыку, шкла, металу і іншых матэрыялаў, як склад адходаў адрозніваецца ў залежнасці ад часу года. Апошні раз такое даследаванне праводзілі ў 2010 годзе.

Цяпер па ўсёй краіне ідзе ліквідацыя міні-палігонаў. Як паведаміў **начальнік аддзела водаправодна-каналізацыйнай гаспадаркі і добраўпарадкавання Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі Аляксей ФІЛАНОВІЧ,** да 2023 года іх наогул не павінна застацца, а плошчы павінны быць рэкультываваны. У некаторых населеных пунктах ужо дзейнічаюць, у іншых яшчэ трэба будзе пабудаваць рэгіянальныя комплексы па абыходжанні з адходамі. Нагадаем, што цяпер ва ўсіх абласных цэнтрах, акрамя Віцебска, працуюць заводы па сартыроўцы смецця. Плануецца, што ў Віцебску такое прадпрыемства ўвядуць у эксплуатацыю ў 2020 годзе. Акрамя таго, працягваецца будаўніцтва біягазавых комплексаў, рыхтуецца ўвядзенне дэпазітна-закладнай сістэмы абыходжання з тарай, развіваецца кампаставанне адходаў. Гэта значыць, задзейнічаны ўсе спосабы і метады максімальнай перапрацоўкі адходаў.

Аксана ЯНОЎСКАЯ.

Класныя навіны

ЗІМОВА-ВЯСЕННІ ПРЫЗЫЎ

у праект «Настаўнік для Беларусі»

Праграма «Настаўнік для Беларусі» аб'явіла старт новаму набору ініцыятыўных педагогаў на наступны навучальны год.

Размова ідзе пра сумесны праект БПС-Ашчадбанка і Міністэрства адукацыі, мэта якога — прыцягнуць у школы ў невялікіх гарадах і населеных пунктах крэатыўных і неабыякавых настаўнікаў, якія хочуць і могуць прыўнесці ў сваю прафесію новыя цікавыя ідэі, умеюць спраўляцца з цяжкасцямі, захоўваючы аптымізм, імкнуцца да самаразвіцця, гатовыя да змен (у тым ліку і да пераезду на новае месца) і вераць у свае сілы.

Падчас летняга інтэнсіву.

Жорсткіх абмежаванняў для ўдзелу ў праграме не існуе: гэта могуць быць як новаспечаныя выпускнікі педагагічных спецыяльнасцяў, так і вопытныя настаўнікі ці нават сям'я педагогаў. Ключавой з'яўляецца наяўнасць профільнай педагагічнай адукацыі або кваліфікацыя педагога.

Праграма адкрывае перад педагогамі ўнікальныя магчымасці для асабістага і прафесійнага росту праз удзел у Летнім інтэнсіве і падтрымліваючыя метадычныя мерапрыемствы. Кожны з іх становіцца часткай прагрэсіўнай настаўніцкай супольнасці.

Немалаважнай з'яўляецца і матэрыяльная падтрымка. Акрамя заработнай платы, удзельнікі праграмы атрымліваюць таксама стыпендыю за дадатковую нагрузку па рэалізацыі праектаў плюс кожны з іх будзе забяспечаны для зручнасці работы ноўтбукам.

Удзельнік сам выбірае і прапрацоўвае праект, які ён будзе рэалізоўваць. Гэта можа быць любая ініцыятыва — ад стварэння дэндрапарку на прылеглай да школы тэрыторыі да адкрыцця на яе базе курсаў па праграмаванні для дзяцей і дарослых. Абавязковая ўмова — ініцыятыва павінна арыентавацца на развіццё мясцовай супольнасці. Маштабны праект можа рэалізоўвацца некалькімі ўдзельнікамі.

Летась для ўдзелу ў праграме «Настаўнік для Беларусі» былі абраныя дзевяць настаўнікаў, якія на два гады адправіліся працаваць у школы ў Кобрынскім (аграгарадок Павіцце), Бярэзінскім (Паплаўскі дзіцячы сад — сярэдняя школа), Чэрвеньскім (Лядзенскі дзіцячы сад — сярэдняя школа) раёнах, у гімназію ў Дзяржынску і Негарэльскую сяроднюю школу № 1.

— Як вы думаеце, што прасцей: знайсці апантаных настаўнікаў ці школы, гатовыя іх прыняць? — разважае **адзін з каардынатараў праграмы Алена МЕЛЬЧАНКА.** — Для школ удзел у праекце можа стаць выдатнай інфармацыйнай нагодай, каб прыцягнуць да сябе ўвагу, і дадатковым імпульсам для развіцця ўстановы. Але сумясціць інтарэсы школ і профіль адабраных у выніку конкурсу педагогаў — задачка няпростая. Летась для ўдзелу ў праекце падало заяўкі каля 20 школ. Іх геаграфія ахоплівала ўсе рэгіёны Беларусі. У самым вострым дэфіцыце былі настаўнікі матэматыкі. Таксама прасілі даслаць да іх фізікаў, настаўнікаў інфарматыкі, геаграфіі, фізічнай культуры, беларускай, рускай і нават кітайскай моў.

Першы крок для ўдзелу ў праграме — запаўненне анкеты на сайце teach4.by. Прыём анкет першай хвалі заканчваецца 10 лютага, другой — 4 мая. Пасля разгляду анкеты пры ўмове яе адпаведнасці крытэрыям удзелу ў Праграме з суіскальнікам звяжацца прадстаўнік каманды «Настаўнік для Беларусі» для правядзення дыстанцыйнага інтэрв'ю. Пры паспяховым яго праходжанні педагог атрымлівае запрашэнне на ўдзел у вочным туры адбору ў Мінску. Для таго каб найбольш аб'ектыўна падысці да выбару будучых удзельнікаў «Настаўніка для Беларусі», камандай праекта з прыцягненнем спецыялістаў па падборы персаналу была распрацавана «Мадэль кампетэнцый», якая грунтуецца на місіі і каштоўнасцях праекта і акумулюе ў сабе вопыт аналагічных праграм па ўсім свеце.

— Мы настроены вельмі аптымістычна, — падкрэслівае Алена Мельчанка. — Спадзяёмся, што другі набор будзе ўдвая большы за папярэдні. Чакаем людзей нераўнадушных, з актыўнай жыццёвай пазіцыяй, разуменнем уласных магчымасцяў, здольных захапіць сваёй ідэяй і павесці за сабой. І мы вельмі чакаем, што геаграфія школ — удзельніц праекта таксама ў наступным навучальным годзе пашырыцца...

Надзея НІКАЛАЕВА.

Фота дадзена каардынатарамі праграмы «Настаўнік для Беларусі».

ДЗВЕ СУСТРЭЧЫ

Як там у вядомай песні: «И я была девушкой юной, сама не припомню когда...» Але ж якраз у тыя залатыя гадкі ў мяне, студэнткі педінстытута, скончылася першая практыка. Дырэктар школы-васьмігодкі падпісаў усе патрэбныя дакументы — характарыстыку, водгук аб уроках... Можна, здавалася б, ад'язджаць, але як, калі рэчаў мнагавата, да станцыі далекавата? Пешшу, значыць, не пойдзеш, а пад'ехаць можна толькі заўтра, бо сёння аўтобуса ўжо няма.

Але ж тут — на маё шчасце — да гаспадароў, у якіх я здымала пакойчык, прыехаў важны госць — на таксі. Я тут жа да шафёра:

— Падвязіце да станцыі!

— Калі ласка, — адказвае той.

Я села, і хоць на дварэ шарэла ўжо, паспела заўважыць, што хлопец за рулём досыць прыгожы — з кучаравым бялявым чубам, што ён за мяне наўрад ці старэйшы, можа, нават не дурны? Адно — лічыльнік чамусьці не ўключыў... Забыўся? А колькі ж мне потым плаціць?

Толькі аб гэтым падумала, як хлопец кажа, што лічыльнік спецыяльна не ўключаў, нават не збіраецца. А ўсё таму, што я яму вельмі спадабалася — настолькі, што грошы браць не збіраецца... Хіба вось зараз машыну спыніць, мы прытулімся адно да аднаго і трохі пасядзім...

У мяне ад гэтых слоў (а машына тым часам і праўда спыняецца...) аж душа ў пяткі!

Нейкім незнаёмым голасам пытаюся:

— Як гэта «мы прытулімся»?! А калі я не хачу... І не ўмею?

— Дык я павучу... А не згодзішся — дык будзем стаяць, пакуль цягнік твой не пойдзе.

На гэтым хлопец і праўда вылез з машыны, закурыў, крыху адышоўся — паказаў, што нікуды не спяшаецца, а вось я...

Што ж, думаю, мне рабіць?

Міжволі ўспомніла «ўрокі цаліны», дзе мы, другакурсніцы, часам падсаджваліся на самазвалы, якія збожжа адвозілі, — пад'язджалі самі, а заадно — вучыліся кіраваць машынай... І таму (адкуль толькі спрыт узяўся?) я выскачыла з таксоўкі, села за руль і хутчэй ад страху, чым нешта цямячы, націснула на газ. Машына рванулася з месца і... паехала.

Кіроўца з немым крыкам кінуўся мне ўслед.

Я тады сцішыла ход — спыніла машыну.

— Вар'ятка! — выдыхнуў хлопец, сагнаў мяне са свайго рабочага месца, мы паехалі далей.

На станцыі ён мяне высадзіў. Нічога не сказаў, грошай не ўзяў.

Гэта была сустрэча першая. Зараз — другая.

Неяк раз з пяцігадовым сынам мы ішлі па вуліцы свайго мястэчка. Здалёку ўбачылі, што з-за павароту, памалу, выехала таксі, прытармазіла побач. З машыны вылез статны, прыгожы з твару мужчына, на ўсе вочы, што называецца, стаў глядзець то на мяне, то на майго малога.

— Не пазнаяце? — спытаў урэшце.

— Не, — адказала, — я вас не ведаю.

— Ды кіньце... Быць таго не можа! Забыліся, як на таксі вярталіся з практыкі?

— Дык гэта вы? — засмяялася я.

— А то ж! — прызнаўся мужчына. — А ўжо ж дурны-дурны!.. Ва ўсякім разе, быў... Ну спадабалася тады дзяўчына, дык не каб пазнаёміцца, пагаварыць, спатканне прызначыць. Вунь чаго захацеў!.. Дык можа, я хоць зараз вас пракачу? Так, без грошай. Малому спадабаецца...

Я падзякавала і, вядома ж, адмовілася.

...Ішла потым і сама сабе ўсміхалася: думала, што зямля і сапраўды круглая. Трэба ж было тады размінуцца, а цяпер сустрэцца!

Зоя Наваенка,

г. п. Падсвілле, Глыбоцкі раён.

ШЫЛА Ў МЯШКУ...

Неяк цёплым вечарам я гатавала вячэру і паралельна, праз адчыненае акно, слухала размовы сваіх суседак. Яны ўжо бітую гадзіну сядзелі на лаўцы ля пад'езда. Спачатку абмяркоўвалі якасць прадуктаў і цэны, потым — узровень заробкаў і рамонт у пад'ездзе...

— І собіла ж майму чалавеку набыць кватэру на першым паверсе, — абуралася суседка знізу. — Жывём цяпер як у нейкай камеры: з аднаго боку пад вокнамі машыны газуюць, з другога — з ліфта цягне... Даў бог суседзяў!

Тут і мне ўжо хацелася «выступіць». Да таго ж я магла, бо вячэра была гатовая — заставалася па прыступках спусціцца ўніз да жанчын, падзяліцца сваёй праблемай. Рэч у тым, што нехта з жыльцоў стаў пад дзверы падкідваць смецце.

— Ну ніякага ж цярпення! Раніцай з кватэры выходзіш, — скардзілася я жанчынам, — пакет стаіць: то бліжэй, то крышку далей, то ля самага ліфта...

— Аніякага сумлення ў людзей! — падтрымала тая суседка з першага паверха. — Дэградацыя ідзе — поўным ходам!

— Так-так, — згаджалася я, — сёння раніцай ужо тры пакеты стаяла!

— У маёй сяброўкі гэтаксама было, — спачувала мне адна з кабет. — Яна ў ЖЭС заяву пісала і ўсё роўна нічога не дабілася: сказалі, што гэта — праблемы саміх жыльцоў.

— А як вырашаць? Гэта што — нікога не хвалюе? — з мальбой у вачах пыталася я ў жанчын.

У адказ павісла маўчанне.

— Я вам дапамагу, — раптам вызвалася адна з суседак. — Заўтра ж высветлю, чыё гэта смецце.

— Ты што — упільнуеш, хто яго выкіне? — засумняваліся жанчыны.

— А навошта мне пільнаваць? Ёсць іншы спосаб.

...Раніцай пакеты са смеццем ужо чакалі мяне ля дзвярэй кватэры. Я не ўтрымалася — гідліва адсунула іх нагой і пабегла на работу, а ўвечары, калі вярталася, пакетаў на месцы ўжо не было. «Можа, дворнічыха прыбрала?» — падумала я і памылілася...

Як потым высветлілася, тая суседка развязала першы ж пакет, рассунула смецце і ў ім тут жа ўбачыла сшытак па матэматыцы вучня 5-га «А» класа Пеці С. Мне засталося пагаварыць з яго мамай.

...Колькі жыву на свеце, столькі захапляюся народнай мудрасцю: шыла ў мяшку і сапраўды не ўтоіш.

Наталля Шастакова,

г. Гомель.

У НОЧ НА КАЛЯДЫ

...Спаць пасля вячэры Сцяпан не збіраўся, бо даўно ўжо ведаў, што, як толькі апошні калядоўшчык пераступіць парог сваёй хаты, на вуліцы выйдзе моладзь: некаму зніме весніцы ды занясе бог ведае куды, некаму падапрэ дзверы — ды так, што, каб выйсці з хаты, давядзецца адымаць падвойнае акно, некаму шклом закрые комін...

Так паўтаралася з году ў год, прычым з шырокім размахам і аднолькавым вынікам: уранку то тут, то там чуўся лямант абураных гаспадароў ці гаспадынь...

Таму найбольш пільныя з іх (і Сцяпан, вядома ж, таксама) спаць не клаліся — прыслухоўваліся да любога тлуму на вуліцы, раз-пораз выходзілі з цёплых хат і ўсё роўна, здаралася, заставаліся ў дурнях.

У той год Сцяпана змарыла з пеўнямі: прыснуў нават не распрануўшыся! І, здавалася ж, на хвіліну ўсяго, а раніцай выйшаў у двор — весніц — новых, прыгожых — як не было!

Гаспадар паспрабаваў разглядаць сляды каля плота. На снезе іх было шмат і розных — «узяць» якісьці адзін мог хіба сабака. А таму Сцяпан пакіраваў у вёску — шукаць сваю прапажу. І недалёка ж зайшоў, як пачуўся гучны голас суседа. «І ў яго, відаць, нешта знеслі?» — падумаў з палёгкай.

...Як на першы погляд, дык на дварэ ў Андрэя нічога не змянілася: брамка была на месцы, платы вакол цэлыя. Але ж суседаў гвалт не сціхаў, і гэта быў верны знак, што ўтворана нешта не зусім звычайнае. І сапраўды — на даху Андрэевай клуні стаяў... воз з узнятымі ўверх аглоблямі.

— Глянь, што ўтварылі! — абураўся гаспадар. — І сам жа не спаў, і сабака ў дварах...

(Вялікі чорны дварняк на ўсялякі выпадак схаваўся ў будцы...)

— У мяне таксама брамку знялі, — каб хоць трохі падтрымаць суседа, уздыхнуў Сцяпан.

— Дык ты, брат, як хочаш, а я не дарую! Саўкава гэта работа! — злаваўся Андрэй і, схапіўшы нейкую палку, смела пакіраваў да хаты зламысніка. — Болей дужых няма... А гэты — бач — сіл назапасіў, што ў таго каня... І на што скарыстаў!.. Абібок няшчасны! Турма па ім плача...

Абібокам (а тым больш няшчасным) Саўка, вядома ж, не быў. Вярнуўшыся з войска, уладкаваўся на работу, разам з бацькамі, як той конь, цягнуў гаспадарку... Яму б яшчэ жонку людскую, ды нешта яна не траплялася, ва ўсякім разе пакуль, а таму дзяцюк , што называецца, тусіў з вясковай моладдзю... Яна, можа, і перагнула з Андрэевым возам, але ж традыцыя ёсць традыцыя: падтрымаць яе — справа гонару.

...Тым часам Андрэй, як віхор, ускочыў у хату да Саўкавых бацькоў, без звычнага прывітання рушыў у пакой, дзе сном немаўляці (ведама, лёг пад раніцу) спаў сам хлопец.

— Ты мне за ўсё адкажаш! — закрычаў Андрэй. — У турму пасаджу!

Хлопец прачнуўся, перахапіў узнятую над ім палку, сказаў:

— Ну тады Івану, сыну свайму, таксама сухароў насушыце.

4. Выдзеўбленая са ствала дрэва лодка з нашытымі для большай устойлівасці бартамі з дошак (9);
5. Пярэдадні свята (9);
6. Невялікі (часцей пясчаны) востраў (5);
7. Змазачнае масла (5);
8. Вялікі высокі будынак (4);
9. Адна дошчачка гонты (7);
10. Журавель каля калодзежа (5).

Склаў Іван МАЗУРУК.

АДКАЗЫ: 1. Гліста; 2. Гіганцік; 3. Выбаршчык; 4. Абшывальнік; 5. Прыспевак; 6. Выспа; 7. Алівa; 8. Гмах; 9. Гонцік; 10. Асеер.

Фестывалім

Студзеньскія вечары ў Брэсце

9 студзеня пачаўся XXXII Міжнародны фестываль класічнай музыкі «Студзеньскія музычныя вечары».

Шэдэўры беларускай, рускай, заходнееўрапейскай музыкі выканаюць салісты і калектывы з 10 краін свету. Афіша фестывалю разнастайная і цікавая, запланавана выступленне шэрагу вакалістаў, пяці аркестраў, двух хароў. Вялікія музычныя вечары, кожны з двух аддзяленняў, пройдуць у Брэсцкім акадэмічным тэатры драмы. Пачатак у 18 гадзін.

У другі дзень фестывалю, 10 студзеня, адбудзецца дзённы канцэрт у музычным каледжы імя Р. Шырмы. Білеты на яго каштуюць усяго 5 рублёў. А ў заключны дзень фэсту, 12 студзеня, прагучыць канцэрт арганнай музыкі. Слухачоў чакаюць у касцёле па вуліцы Леніна. Калядны баль у рамках фестывалю запрашае ўсіх у Брэсцкі акадэмічны тэатр драмы 11 студзеня.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Даты | Падзеі | Людзі

10 СТУДЗЕНЯ

У краіне

1875 год — нарадзіўся (Магілёў) Ісаі Шур, нямецкі матэматык, член Прускай АН (1922-1938), член-карэспандэнт АН СССР (1929). У 1901-м скончыў Берлінскі ўніверсітэт, дзе працаваў у 1903—1911 і 1916—1935 гадах. У 1911—1916 гадах — прафесар Бонскага ўніверсітэта. З 1939-га жыў і працаваў у Палесціне.

1905 год — нарадзілася Таццяна Васілеўна Бірыч, беларускі афтальмолаг, доктар медыцынскіх навук (1948), прафесар (1948), член-карэспандэнт НАН Беларусі (1972), заслужаны ўрач Беларусі (1948), заслужаны дзеяч навукі Беларусі (1964), Герой Сацыялістычнай Працы (1974). Аўтар больш чым 150 навуковых прац.

1910 год — нарадзіўся Васіль Васілевіч Галубовіч, беларускі тэатральны мастак. З 1933-га працаваў у тэатрах Расіі і Казахстана. У 1958—1962 гадах — галоўны мастак Беларускага тэатра імя Янкі Купалы, з 1963-га да 1973-га — Дзяржаўнага рускага драматычнага тэатра Беларусі. Адначасова ў 1959—1965 гадах выкладаў у Беларускім тэатральна-мастацкім інстытуце. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1952).

1925 год — нарадзіўся Рыгор Філатавіч Фамічоў, удзельнік партызанскага руху на тэрыторыі Баранавіцкай вобласці ў гады Вялікай Айчыннай вайны, партыйны і дзяржаўны дзеяч Беларусі.

1925 год — у Мінску адкрыўся Усебеларускі з'езд работнікаў сельскай гаспадаркі.

1940 год — нарадзіўся Яраслаў Іванавіч Клімуць, беларускі крытык, літаратуразнаўца, кандыдат філалагічных навук (1979). З 1975-га працуе ў Магілёўскім універсітэце імя А. Куляшова. Даследуе шляхі развіцця і стан сучаснай беларускай паэзіі і прозы, узаемасувязі і ўзаемаўплыў беларускай і рускай літаратур.

2000 год — Савет Міністраў Беларусі прыняў рашэнне «Аб мерах па развіцці кальцавой дарогі вакол Мінска ў 2000—2005 гадах».

У свеце

1863 год — у брытанскай сталіцы адкрылася першая ў свеце лінія метро — славутая лонданская падземка. У першы ж дзень саставамі на паравой цязе было перавезена 30 тысяч чалавек. У 1880 годзе пасажырапаток склаў 40 мільёнаў чалавек у год, а ў 2007-м ён дасягнуў ужо мільярда!

1920 год — уступіў у сілу Версальскі мірны дагавор, які скончыў Першую сусветную вайну.

1945 год — нарадзілася Валянціна Іванаўна Цялічкіна, расійская актрыса, народная артыстка Расіі. Здымалася ў фільмах «Журналіст», «Пачатак», «Пяць вечароў», «Васа». У гэты ж дзень з'явіўся на свет Род Сцюарт, англійскі эстрадны спявак, кавалер Ордэна Брытанскай імперыі (2006).

1946 год — у Лондане адкрылася першая сесія Генеральнай Асамблеі ААН.

1975 год — запісана першая тэлеперадача «Што? Дзе? Калі?», тады яшчэ мала падобная на сучасны фармат. Тады змагаліся паміж сабой не знаўцы, а сем'і.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	9.25	17.10	7.45
Віцебск —	9.21	16.52	7.31
Магілёў —	9.15	17.00	7.45
Гомель —	9.03	17.04	8.01
Гродна —	9.39	17.26	7.47
Брэст —	9.31	17.35	8.04

Месяц

Поўня ў 22.21.
Месяц у сузор'і Рака.

Імяніны

Пр. *Агафіі, Зіновіі, Ігната, Ніканора, Пятра, Яфіма.*
К. *Адрыяна, Ады, Вільгельма, Дануты, Рыгора, Яна.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

— Ведаеш, я на Новы год у караоке-клубе спявала. Дык адзін мужык падышоў, даў мне 50 рублёў і сказаў, каб я замоўкла.

— На гэтым можна зарабляць!

Адзін хлопчык папрасіў Дзеда Мароза, каб, калі ён вырасце, на работу хадзіць толькі па заробак або па выручку.

І Дзед Мароз выканаў яго жаданне.

Ён працуе інкасатарам.

— Добры дзень. Я хацеў бы купіць сумачку ў падарунак сваёй жонцы.

— Мадэль? Колер?

— Давайце любую, яна ўсё роўна прыйдзе яе мяняць.

Трэба пачаць называць гады жыцця «ўзроўнямі», таму што фраза «я на 43-м узроўні» гучыць нашмат круцей, чым усведамленне, што ты ўжо зусім не маладзён.

caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79,

e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 82.

Нумар падпісаны ў 19.30 9 студзеня 2020 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

10 студзеня 2020 г. № 1 (537)

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

ТЭМА ТЫДНЯ

ГРОШЫ НАПАЛАМ І ТЫПАВОЕ ЎЦЯПЛЕННЕ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Санітарным нормам і спажывецкім якасцям сёння не адпавядае да 30 % кватэр у Беларусі. Паляпшаць якасць жылля зручней і танней з дапамогай энергаэфектыўных мерапрыемстваў падчас капітальнага рамонту. Комплексна такім чынам мяркуецца павысіць энергаэфектыўнасць будынкаў на адзін-два класы і давесці энергаспажыванне да ўзроўню не вышэй за 90 кВт•г/м² у год. Аднак механізмы, якія тлумачылі б, як працаваць з энергаэфектыўнымі мерапрыемствамі падчас капрамонту, на жаль, адсутнічаюць. Не распрацаваны пакуль што Міністэрствам фінансаў і механізм стварэння рахункаў энергаэфектыўных мерапрыемстваў. Як, за што і чаму будуць пры гэтым плаціць жыхары, што змогуць выбраць, а на што давядзецца пагаджацца абавязкова, «МС» даведалася ў спецыялістаў.

стар. 13

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

Сталічны час: якія задачы на парадку дня?

Старшыня верхняй палаты парламента Наталля Качанава сустрэлася з членамі Савета Рэспублікі ад горада Мінска

Сустрэчы з парламентарыямі ў такім фармаце (па рэгіёнах) адбываюцца ўпершыню. Да гэтага часу ўжо праведзены нарады з сенатарамі Гомельскай, Віцебскай абласцей. Учора на парадку дня былі задачы для прадстаўнікоў сенатарскага корпуса Мінска.

«Важная работа, таму што гэта фармат, калі мы звяраем гадзіннікі ў сваёй рабоце. Пэўныя пытанні мы хочам давесці да сенатараў і ў той жа час слухаем іх пытанні, тыя задачы, якія стаяць перад імі на месцах. У прыватнасці, у горадзе Мінску пры адміністрацыях. Такая форма работы будзе працягнута», — сказала Наталля Качанава, адзначыўшы, што ў найбліжэйшы час адбудуцца сустрэчы са старшынямі абласных Саветаў дэпутатаў у сталіцы, а потым пачнецца работа ў рэгіёнах.

Бягучы год, як ужо неаднойчы гучала ад прадстаўнікоў улады, — значны. Завяршаецца пяцігодка, ствараецца база, фарміруецца праграма для работы на наступную. Плюс 2020-ы — год электаральны. Таму кіраўніцтва верхняй палаты парламента нацэлена на актыўнае ўзаемадзеянне з усімі прадстаўнікамі дэпутацкага корпусу, які ёсць у краіне — ад раённых Саветаў да Савета Рэспублікі.

стар. 2—3

СЁННЯ Ў НУМАРЫ

Зямельнае пытанне няпростае

Атрымаць кавалак зямлі побач са сталіцай ці ўзаконіць другі пабудаваны на ўчастку дом? стар. 3

У чаканні аўтакрамы

Што яшчэ хвалюе жыхароў прысталічнага рэгіёна, высвятляла старшыня Мінскага аблсавета дэпутатаў. стар. 4

Цяпло таннейшае

На якія мэты Сусветны банк разам з Еўрапейскім інвестыцыйным банкам выдзяляюць 60 мільёнаў долараў? стар. 14

Чарга на «амаладжэнне»

У Мінску капрамонты плануюцца згодна з «узростам» і па паролі. стар. 14

Не блытаць з капрамонтам!

Як на прыкладзе Магілёўскай вобласці рэалізуецца пілотны праект па мадэрнізацыі шматкватэрных дамоў. стар. 15

НАШЫ ДЗЕЦІ

Кожны, хто патрабуе ўвагі, павінен яе атрымаць

Акцыя «Нашы дзеці» дэманструе неабыякавасць з боку яе ўдзельнікаў

«МС» ужо знаёміла чытачоў з тым, як члены Савета Рэспублікі далучыліся да рэспубліканскай дабрачыннай акцыі, накіраванай на падтрымку ўразлівай катэгорыі дзяцей. Але сёння хочам звярнуць увагу яшчэ на два адрасы, дзе пабывалі сенатары: Гродзенскі абласны спецыялізаваны дом дзіцяці для дзяцей з арганічным паражэннем цэнтральнай нервовай сістэмы з парушэннем псіхікі і сацыяльна-педагагічны цэнтр з прытулкам Заводскага раёна Мінска.

У першы завітаў **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Віктар ЛІСКОВІЧ,** які адзначыў, што кожны год бывае тут, каб павіншаваць выхаванцаў інтэрната, уручыць ім падарункі і паглядзець, у якіх умовах знаходзяцца дзеці, ці ўсё ў іх ёсць для таго, каб быць на роўных са сваімі аднагодкамі.

— Цяпер створаны ўсе ўмовы для таго, каб нашы дзеці маглі вучыцца і развівацца, праяўляць свае таленты як у звычайных сем'ях, так і ў прыёмных і шматдзетных, ва ўстановах падобнага тыпу, — адзначыў ён.

Разам з сенатарам у навагодняй акцыі ўдзельнічалі дэпутаты гарадскога і абласнога Саветаў дэпутатаў, прадстаўнікі аблвыканкама, кіраўнікі вядучых устаноў аховы здароўя Гродзеншчыны.

А да выхаванцаў сацыяльнага прытулку Заводскага раёна сталіцы завіталі старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей РАЧКОЎ, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Галіна ЛАГУНОВА, кіраўнік адміністрацыі Заводскага раёна Сяргей МАСЛЯК і іншыя ганаровыя госці, якія стварылі сапраўднае свята. Малыя атрымалі камп'ютары, планшэты, пыласос, парасоны і, вядома, прысмакі. Акрамя таго, усіх дзяцей чакаў сюрпрыз — кожнаму выхаванцу падарылі тое, пра што ён прасіў у лісце да Дзеда Мароза.

Але не толькі малым адрасаваліся падарункі: Сяргей Рачкоў уручыў супрацоўнікам цэнтра сертыфікат на 2 тысячы рублёў ад Савета Рэспублікі, бо ў планах адміністрацыі — зрабіць сталоўку ў прытулку яшчэ лепшай і прыгажэйшай.

Дарэчы, зараз у прытулку пры сацыяльна-педагагічным цэнтры Заводскага раёна Мінска знаходзіцца 31 выхаванец. Дзеці забяспечаны ўсім неабходным, але кожны (як і любое іншае дзіця) чакае святочнага цуда і марыць пра шчаслівую сям'ю.

Трэба сказаць, што ўдзелам у дабрачыннай рэспубліканскай акцыі «Нашы дзеці» ўвага сенатараў да ўразлівай катэгорыі малых не абмяжоўваецца. У панядзелак, 13 студзеня, напрыклад, спікер верхняй палаты парламента Наталля Качанава сумесна з членамі Прэзідыума Савета Рэспублікі наведае Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр дзіцячай анкалогіі, гематалогіі і імуналогіі. Сенатары павіншуюць маленькіх пацыентаў з новым 2020 годам, што ўступіў у свае правы, а таксама возьмуць удзел у круглым стале разам з членамі Савета Рэспублікі, кіраўніцтвам цэнтра і Міністэрствам аховы здароўя. Больш падрабязна аб гэтым «МС» раскажа ў наступным нумары.

Вольга АЛЯКСАНДРАВА.
Фота sovrep.gov.by

Сталічны час: якія задачы

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

«Дэпутаты — гэта тыя, каго абірае народ, каму ён давярае ў поўнай меры, — нагадала спікер Савета Рэспублікі. — Трэба паглядзець, як дэпутацкія наказы выконваюцца на месцах. Калі цябе выбралі і ты ўжо працуеш, не павінен забывацца пра тыя абяцанні, якія даваў людзям падчас выбараў».

На нарадзе для сенатараў гучала задача часцей размаўляць і сустракацца з грамадзянамі — на прадпрыемствах, сацыяльных аб'ектах, закранаючы праблемы адукацыі, аховы здароўя і іншыя сацыяльныя тэмы. «Дакладна ўпэўнена ў тым, што калі людзі інфармаваныя, ведаюць пытанні, якія іх хвалююць, яны больш спакойна адносяцца да ўсяго, што адбываецца», — падкрэсліла Наталля Качанава.

У сталіцы, дзе па афіцыйных звестках пражывае амаль два мільёны мінчан, дэпутацкі корпус прадстаўлены 60 членамі гарадскога Савета дэпутатаў, 20 чалавекамі, што працуюць у ніжняй палаце парламента, і васьмю сенатарамі. Як паказвае практыка, найбольш актыўнае насельніцтва — гэта жыхары гарадоў. Не толькі сталіцы, але і гарадоў абласнога падпарадкавання, абласных цэнтраў.

«Аналізуючы сітуацыю, якая адбываецца вакол нас ці ў цэлым у краіне, мы адкуль бяром інфармацыю пра тое, што хвалюе нашых грамадзян? Канешне, гэта прыёмы па асабістых пытаннях, звароты, якія паступаюць да нас», — адзначыла спікер Савета Рэспублікі.

Абмяркоўваючы на сустрэчы з членамі верхняй палаты праблемы горада Мінска, Наталля Качанава зрабіла акцэнт на выроўніванні заробкаў на прадпрыемствах. «Ёсць дакладна вызначаныя задачы па заробках. Нягледзячы на тое што даходы ў жыхароў сталіцы сёння самыя высокія ў краіне, сапраўды тут горад Мінск — лідар па гэтых паказчыках, ёсць прадпрыемствы, дзе заробкі сёння не дацягваюць на пэўнага ўзроўню. Таму трэба глядзець на эфектыўную работу кожнага прадпрыемства, арганізацыі», — паведаміла яна.

З месяца ў месяц каля пяці ці больш арганізацый не выплачваюць своечасова заробкі. «У найбліжэйшы час я буду на адным з прадпрыемстваў, дзе правяду інфармацыйную сустрэчу ў калектыве. Таму нам трэба глядзець, каб заробкі выплачваліся своечасова. Так, можна сказаць, што гэта не нашая задача, мы працуем над законапраектамі. Але як не наша? — задала пытанне Наталля Качанава. — Людзей гэта хвалюе, яны звяртаюцца да нас, і мы будзем хадзіць у калектывы і бачыць гэта. Значыць, трэба дакладна ўказваць на гэта органам улады. Не павінна быць такая сітуацыя ў Мінску».

Указам Прэзідэнт зацвердзіў законапраекты, над якімі дэпутатам і сенатарам неабходна працаваць у перспектыве. Па словах Наталлі Качанавай, у найбліжэйшыя дні адбудзецца сумесная сустрэча старшынь пастаянных профільных камісій Палаты прадстаўнікоў і Савета Рэспублікі. На ёй будуць вызначаны падыходы ў агульнай заканатворчай дзейнасці.

«Мы дакладна для сябе вызначылі, што не можам далучацца да законапраектаў тады, калі яны выходзяць на фінішную стадыю. Мы будзем дамаўляцца пра тое, што павінны далучацца да распрацоўкі законапраектаў на самай пачатковай стадыі. Па меры магчымасцяў», — заўважыла спікер верхняй палаты парламента.

Асаблівую ўвагу накіравала яна на гэтую дзейнасць старшынь камісій, якія працуюць у Савеце Рэспублікі на прафесійнай аснове.

> «Дэпутаты — гэта тыя, каго абірае народ, каму ён давярае ў поўнай меры, — нагадала спікер Савета Рэспублікі. — Трэба паглядзець, як дэпутацкія наказы выконваюцца на месцах. Калі цябе выбралі і ты ўжо працуеш, не павінен забывацца пра тыя абяцанні, якія даваў людзям падчас выбараў».

На парадку дня ў Мінску пытанні развіцця горада як сталіцы, жамчужыны Беларусі, эстэтызацыя навакольнага асяроддзя, добраўпарадкаванне гарадскіх тэрыторый, завяршэнне будаўніцтва шматлікіх аб'ектаў, забеспячэнне транспартнай інфраструктурай, якая звяжа мегаполіс з гарадамі-спадарожнікамі, наладка работы хуткасных экалагічных гарадскіх трамваяў.

«Гэтыя пытанні вельмі важныя для горада. Перспектывы развіцця яго неабходна бачыць: не толькі, як ён будзе жыць сёння ці заўтра, а і на дзесяцігоддзе наперад, каб быў камфортны, зручны для жыхароў», — падкрэсліла старшыня верхняй палаты парламента.

Наконт выканання прагнозных паказчыкаў сацыяльна-эканамічнага развіцця на 2020-ы гораду

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

ВАЖНА ЎМЕЦЬ СЛУХАЦЬ І ЧУЦЬ ЛЮДЗЕЙ

Члены Савета Рэспублікі распачалі загадзя аб'яўленыя прыёмы грамадзян, а таксама іх прадстаўнікоў і прадстаўнікоў юрыдычных асоб. Першы ў новым годзе такі прыём правёў у Мінску намеснік старшыні Савета Рэспублікі Анатоль Ісачанка.

Фота БелТА.

І першы ж наведвальнік прыйшоў і са сваім болем, і са сваёй праўдай, і са стосам папер, якія выдатна аргументуюць, як яму здаецца, яго бясспрэчную пазіцыю. Не будзем пераказваць сутнасць даволі працяглай і эмацыянальнай прамовы бізнесмена пра праблемы, з якімі сутыкнулася прыватнае навукова-вытворчае прадпрыемства ў адным з раёнаў Мінскай вобласці. У рэшце рэшт яно трапіла пад ліквідацыю. Сумны фінал.

Анатоль Ісачанка пасля ўдакладняючых пытанняў прапанаваў наведвальніку распачаць бізнес з чыстага аркуша. Што мелася на ўвазе? Адрадзіць на новым месцы прыватнае навукова-вытворчае прадпрыемства «Еўфрасіння» — скажам, у адным з раёнаў Мінскай вобласці дапамагчы з пошукам памяшкання плошчай прыкладна 200 квадратных метраў, неабходнага для выпуску запатрабаваных беларускім спажыўцом інавацыйных тавараў.

Прадпрымальніку такая ідэя спадабалася. Ён у цэлым станоўча адазваўся аб практыцы правядзення прыёмаў грамадзян членамі Савета Рэспублікі. А Анатолю Ісачанку выказаў асабістую падзяку за разуменне яго складанай жыццёвай сітуацыі, жаданне ўнікнуць у праблему і, галоўнае, за імкненне пасадзейнічаць на справе.

Тут можна зразумець адмоўныя і станоўчыя эмоцыі суразмоўцы намесніка старшыні Савета Рэспублікі. Цяпер толькі ў Мінскай вобласці працуе прыблізна 37 тысяч прадпрымальнікаў. І не ва ўсіх бізнес адразу ідзе лёгка, паспяхова і без праблем, з аднымі толькі прыбыткамі і фарамі: не абыходзіцца без складанасцяў, часам банкруцтваў і ліквідацый.

Відаць, невыпадкова ў размове з журналістамі па выніках прыёму Анатоль Ісачанка адзначыў, што вельмі важна ў час прыёмаў грамадзян умець слухаць і чуць людзей, імкнуцца разумець іх праблемы, падказваць шляхі іх вырашэння. Але садзейнічаць выключна ў рамках закону, а калі нельга дапамагчы, то пра гэта казаць прама і адкрыта.

Леанід ТУГАРЫН.

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

ШПІТАЛІЗАЦЫЯ, АЎТАКРАМА І ПАВОДЗІНЫ СУСЕДЗЯЎ

Што яшчэ хвалюе жыхароў Міншчыны?

Уважліва выслухала кожнага заяўніка падчас прамой тэлефоннай лініі старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Наталля ЯКУБІЦКАЯ. Званкоў, як заўсёды, было даволі шмат. Некаторыя пытанні вырашыліся на месцы, іншыя будуць вывучаны з удзелам профільных спецыялістаў, з выездам на месца, а людзі атрымаюць адказы.
Дадам, што людзей хвалявалі самыя розныя жыццёвыя праблемы: яны датычыліся сацыяльных, камунальных аспектаў, камфортнага пражывання, развіцця інфраструктуры, транспартных зносін, здароўя.

Фота з архіва «МС».

Аляксандр Віктаравіч з вёскі Карсакавічы Барысаўскага раёна — інвалід II групы. Здароўе, вядома, і так, мякка кажучы, не волатаўскае. А апошнім часам самаадчуванне значна пагоршылася. Мужчына прасіў пасадзейнічаць яму ў лячэнні.

Наталля Віктараўна патэлефанавала галоўнаму ўрачу цэнтральнай раённай бальніцы Аляксандру Дразду і растлумачыла сітуацыю: чалавек скардзіцца на моцны галаўны боль, недамаганне.

— Я лічу, што пра яго трэба паклапаціцца, магчыма, яму неабходная шпіталізацыя, — параіла яна.

— Мы добра ведаем нашага пацыента, неаднаразова прапаноўвалі такі варыянт, але ён адмаўляўся, — канстатаваў Аляксандр Анатолевіч.

— Вы гатовы ехаць у бальніцу? — запыталася старшыня аблсавета ў заяўніка. — Сёння зможаце за ім адправіць «хуткую»? — пацікавілася яна ў галоўнага ўрача.

Спецыяліст даў сцвярджальны адказ.

— У такім разе не пярэчце, збірайцеся на лячэнне, — параіла Наталля Якубіцкая пенсіянеру.

З Салігорскага раёна патэлефанавала Таццяна Якаўлеўна, інвалід II групы. Жанчына прасіла паратунку ад суседзяў, якія не даюць спакойна жыць. Яе кватэра знаходзіцца на другім паверсе, а на першым жыве маці з адзінацацігадовым сынам. Хлопчык, як сцвярджае Таццяна Якаўлеўна, увесь час крычыць, тупае, бегае, аж люстра на столі трасецца. І так можа працягвацца суткамі. «У мяне цэлы букет хвароб, мне патрэбны адпачынак. Сёння заснула толькі а пятай гадзіне раніцы, калі падлетак супакоіўся. Скардзілася неаднойчы ў дамаўпраўленне, міліцыю. Прыязджаюць на выклікі, але ніхто не можа нічога зрабіць з агрэсіўным хлапчуком. Куды можна звярнуцца, каб уціхамірылі падлетка?» — ледзьве не плакала ў трубку жанчына.

— Мы будзем шукаць нейкія варыянты, каб дапамагчы вам, — паабяцала Наталля Віктараўна. Яна адразу ж патэлефанавала старшыні раённага Савета дэпутатаў Але Калеевай і кіраўніку раёна Андрэю Жайловічу і растлумачыла ім сутнасць справы.

— Магчыма, ёсць неабходнасць стварыць камісію з ліку спецыялістаў сістэмы адукацыі, аховы здароўя, якія б абследавалі дзіця, падлячылі, — прапанавала яна.

— Думаю, з гэтым не будзе праблем, — запэўніў старшыня райвыканкама.

Тамара Сцяпанаўна жыве ў вёсцы Чурылава Уздзенскага раёна. У населеным пункце закрылі стацыянарную краму. А аўтакрама, якая павінна прыходзіць сюды два разы на тыдзень — у сераду і суботу, — не вытрымлівае графік, можа і наогул аб'ехаць Чурылава бокам. Рэч у тым, што Уздзенскі райспажыўсаюз далучылі да Дзяржынскага, і, магчыма, таму склалася такая сітуацыя. Наталля Віктараўна набрала нумар тэлефона намесніка старшыні па эканоміцы Уздзенскага райвыканкама Веры Барысевіч і папрасіла разабрацца ў сітуацыі. Пры гэтым абавязкова паведаміць Тамары Сцяпанаўне, калі чакаць «краму на колах» у вёсцы.

У Таццяны Сяргееўны са Смалявіч у адным з пакояў не грэюць батарэі. А ў яе на руках малое дзіця. Вядома, маці хвалюецца, каб немаўля не захварэла. Жанчына звярталася ў мясцовую ЖКГ, райвыканкам, прыходзілі майстры, але прычыну выявіць не могуць.

Гаспадыня расказала, што ў гэтым доме жыве два гады. Летась з ацяпленнем усё было нармальна, сёлета пры яго падключэнні — таксама. Наталля Віктараўна звязалася з выканаўцам абавязкаў старшыні райвыканкама Мікалаем Парамонавым, які курыруе сферу ЖКГ, і папрасіла ўзяць пытанне пад асабісты кантроль і неадкладна выправіць становішча.

Віктар Віталевіч са Смалявіч звярнуўся да старшыні абласнога Савета дэпутатаў ад імя бацькоў студэнтаў. Апошнім часам дабрацца да месца вучобы дзецям стала праблематычна, бо адмянілі цягнікі эканомкласа. А хуткія цягнікі ў бок Віцебска і ў адваротным напрамку спыняюцца толькі ў Барысаве, пралятаючы Смалявічы і Жодзіна. Наталля Якубіцкая паабяцала накіраваць запыт у Мінскае аддзяленне Беларускай чыгункі.

Адразу трое членаў жыллёва-будаўнічага вытворчага кааператыва «Дружны—2011» з Мінскага раёна паскардзіліся, што дом здадзены з недапрацоўкамі.

> Тамара Сцяпанаўна жыве ў вёсцы Чурылава Уздзенскага раёна. У населеным пункце закрылі стацыянарную краму. А аўтакрама, якая павінна прыходзіць сюды два разы на тыдзень — у сераду і суботу, — не вытрымлівае графік, можа і наогул аб'ехаць Чурылава бокам.

— Мне тэлефанаваў старшыня вашага кааператыва Сяргей Грыдзін. Мы гэтым пытаннем займаемся, быў у мяне і старшыня Мінскага райвыканкама Іван Крупко. Перад заказчыкам — Упраўленнем капітальнага будаўніцтва — пастаўлена задача па вашым доме. Яны будуць выходзіць на Салігорскі домабудаўнічы камбінат, які з'яўляўся падрадчыкам. Гэтая праблема агучана на ўсіх узроўнях. Таму мы яшчэ раз пралангуем гэтае рашэнне, — запэўніла Наталля Якубіцкая.

САДЗЕЙНІЧАННЕ ЗАНЯТАСЦІ

ПАМІЖ БІЗНЕСАМ І ЎЛАДАЙ

павінна быць спрыяльнае асяроддзе

Поспехі і праблемы развіцця малога і сярэдняга бізнесу прааналізавалі ўдзельнікі пасяджэння Мінскага абласнога Савета па развіцці прадпрымальніцтва.

Мінская вобласць трэці год запар прызнаецца самым спрыяльным рэгіёнам Беларусі для вядзення малога і сярэдняга бізнесу. Удзельная вага валавога дабаўленага кошту, што фарміруецца суб'ектамі гэтага сектара эканомікі, складае больш за 33 %. У 2020-м яна плануецца на ўзроўні каля 34,2 %.

— Апошнім часам актывізаваліся саветы па развіцці прадпрымальніцтва ў Мінскай вобласці. Такія структуры створаны ў кожным раёне. Кіраўніком дзяржавы пастаўлена задача дасягнуць 100 мільярдаў долараў унутранага валавога прадукту ў 2025 годзе. Малы і сярэдні бізнес — адзін з лакаматываў выканання гэтага паказчыка, — упэўнены **намеснік старшыні Мінскага абласнога Савета па развіцці прадпрымальніцтва, генеральны дырэктар ЗАТ «МАП» ЗАТ» Сяргей НАЙДОВІЧ.** — Наша вялікае жаданне, каб развіваліся аддаленыя ад сталіцы раёны — Крупскі, Старадарожскі, Бярэзінскі, каб там з'яўляліся новыя прадпрыемствы, у першую чаргу прамысловыя. У раёнах сфарміраваны зямельныя ўчасткі пад інвестыцыйныя дагаворы, якія можна заключаць у адпаведнасці з Дэкрэтам Прэзідэнта № 10 з пэўным наборам ільгот. Актыўна развіваецца свабодная эканамічная зона «Мінск», з'явіцца інвестыцыйныя пляцоўкі ў Чаркасах Дзяржынскага раёна, запланаваны грашовыя сродкі для падрыхтоўкі інфраструктуры ў Жодзіне. Мы гатовыя разглядаць усе прапановы бізнесу па любых пытаннях.

Больш за 70 % малога і сярэдняга бізнесу на Міншчыне занята ў сферы паслуг, у тым ліку каля 30 % — у гандлі. Сёлета найбуйнейшыя гандлёвыя сеткі пабудуюць аб'екты ў Смалявіцкім, Барысаўскім раёнах, Крупках, Чэрвені. Што датычыцца прамысловай вытворчасці, то тут сканцэнтравана 9,3 %, у будаўніцтве — крыху больш за 8 %, у сельскай і лясной гаспадарцы — 3,3 %.

Намеснік старшыні Мінаблвыканкама Мікалай РАГАШЧУК падкрэсліў, што ў Мінскай вобласці за студзень—кастрычнік 2019 года зарэгістравана 1468 юрыдычных асоб і 5438 індывідуальных прадпрымальнікаў. На Міншчыне працуюць сем інкубатараў малога бізнесу, сямнаццаць цэнтраў падтрымкі прадпрымальніцтва. У перспектыве такія з'явяцца ў Барысаўскім, Уздзенскім, Маладзечанскім раёнах.

Разам з тым на пасяджэнні агучылі і праблемы, з якімі сутыкаюцца бізнесмены. Напрыклад, складана змяніць мэтавае прызначэнне зямельнага ўчастка. Часам для гэтага патрабуецца рашэнне Прэзідэнта. «Прадаём, напрыклад, недабудаваную бальніцу, неабходна адразу ж папярэджваць пакупніка аб яе мэтавым выкарыстанні», — адзначыў **старшыня Мінаблвыканкама Аляксандр ТУРЧЫН.**

Яшчэ адна праблема — патрабаванне распрацаваць і зацвердзіць праект рэканструкцыі будынка. Часта бывае, што гэта старыя аб'екты, якія не адпавядаюць сучасным нормам. Пакупніку нявыгадна выраблять дакументацыю, якая абыходзіцца дорага. Прасцей знесці памяшканне і пабудаваць новае.

— У мяне асноўнае патрабаванне да райвыканкамаў — абапірацца на літару закону. Але бываюць выпадкі, калі трэба прымаць нестандартныя рашэнні. Галоўнае — пазбавіцца ад суб'ектывізму ў рабоце, нельга кіравацца прынцыпам «не хачу — значыць, працягваць дагавор не буду». На такія факты пры іх наяўнасці буду вельмі жорстка рэагаваць. Паміж бізнесам і ўладамі павінны быць прыязныя адносіны, спрыяльнае асяроддзе. З гэтага пасылу мы будзем будаваць работу і падтрымліваць ініцыятывы ў любым кірунку, — падкрэсліў губернатар. — Многія праблемы неабходна вырашаць на мясцовым узроўні. Яны не павінны даходзіць да ўрада, нават падымацца да ўзроўню аблвыканкама.

Матэрыялы паласы падрыхтавала Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

Тэлесеткі

«НАША РАНІЦА» ТРЫМАЕ Ў ТОНУСЕ

Ранішняя праграма на тэлеканале АНТ з 14 студзеня выйдзе ў абноўленым фармаце. У «Нашай раніцы» зменяцца лакацыі, з'явяцца новыя рубрыкі і вядучы.

На АНТ адзначаюць, што не імкнуліся правесці рэбрэндынг, але каманда ранішняга эфіру ўвесь час вывучае вопыт замежных калег, каб ісці ў нагу з часам. Акцэнт на інфармацыйным стылі ранішняга вяшчання застанецца такім жа, а вось асноўныя здымачныя лакацыі зменяцца. З'явяцца таксама новыя рубрыкі. Так, напрыклад, вядучы Герман Цітоў будзе весці кулінарны праект, а для мам і дзетак алімпійская чэмпіёнка Ала Цупер стане праводзіць урокі гімнастыкі. Не абмінулі ўвагай і мужчынскую аўдыторыю: для яе запускаюць новую рубрыку «На рыбалцы з Канстанцінам Сцепанцом. Запіскі влогера», дзе карэспандэнт «Нашых навін» будзе дзяліцца сваім хобі з беларусамі.

— Любая праграма — гэта жывы арганізм. І калі не змяняцца і не абнаўляцца, то можна хутка страціць тонус. У эпоху кліпавага мыслення, калі чалавек успрымае толькі кароткую інфармацыю, быць пачутымі аўдыторыяй можна толькі тады, калі сам прыслухоўваешся да яе, прапаноўваючы тэлевізійны прадукт на любы густ, узрост і здзіўляючы нечым новым, — зазначае **дырэктар дырэкцыі ранішняга вяшчання ЗАТ «Другі нацыянальны канал» Таццяна РУДАКОЎСКАЯ.** — Чакае прыхільнікаў праекта і знаёмства з новым вядучым, а магчыма і двума. Аднак інтрыгу адносна таго, хто гэтыя людзі, пакуль адкрываць не стану. Уключайце праграму «Наша раніца» 14 студзеня ў 6.00, і самі ўсё ўбачыце».

Алена ДРАПКО.

ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 85

Сённяшняя задача належыць расійскаму складальніку Валерыю Іванову ***(гл. дыяграму).***

Белыя: Крd3, Лd6, Кg5, Кh3, пh2 (5).

Чорныя: Крg4, пd7 (2).

Мат за 3 хады.

Дасылайце рашэнні на адрас рэдакцыі («Звязда», вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, Мінск, 220013, або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru.

* * *

У наступнай пазіцыі з кнігі «Нанесці ўдар у дэбюце» беларускіх аўтараў Сцяпана Давыдзюка і Людмілы Мартынюк матэрыяльная перавага ў чорных, але белыя пры сваім ходзе перамагаюць. Прапануем знайсці гэты выйгрыш.

Белыя: Крh1, Фd5, Ла1, Ле1, Cg5, Кb1, пп. a2, b2, c3, g2, h2 (11).

Чорныя: Крg8, Фf7, Ла8, Лh8, Сc8, Cg7, Кb8, пп. a7, b7, c7, d7, g6, h7 (13).

* * *

У Маскве прайшлі чэмпіянаты свету па хуткіх шахматах (рапідзе) і бліцы. Сярод мужчын (207 удзельнікаў з 45 краін, у тым ліку 158 гросмайстраў) у абедзвюх намінацыях перамог дзеючы чэмпіён свету па класічных шахматах Магнус Карлсен (Нарвегія). З трох беларускіх удзельнікаў у рапідзе найлепшы вынік паказаў Уладзіслаў Кавалёў — 47-е месца. Вось дзве яго пераможныя партыі.

Аляксандр Рахманаў — Уладзіслаў Кавалёў. 1. c4 Кf6 2. Кc3 e6 3. e4 c5 4. Кf3 Кc6 5. Ce2 e5 6. d3 d6 7. 0-0 g6 8. a3 Cg7 9. b4 0-0 10. Лb1 b6 11. Кd5 h6 12. Cd2 Ce6 13. Фc1 g5 14. bc dc 15. h4 g4 16. Kh2 Kd4 17. Cd1 K:d5 18. cd Cd7 19. K:g4 Ф:h4 20. K:h6+ Kph7 21. Cg5 C:h6 22. C:h4 C:c1 23. Л:c1 f5 24. f4 fe 25. de Cb5 26. Лf2 ef 27. e5 Лf5 28. Cf6 Лg8 29. Лc3 Крg6 30. a4 Ca6 31. Лh3 Cb7 32. Cf3 Л:f6 33. ef Кр:f6 34. Лh7 K:f3+ 35. Л:f3 C:d5 36. Л:f4+ Крe5 37. Лf2 c4 38. Лd7 c3 39. Крf1 Лc8 40. Лe2+ Крd4 41. Лc2 a6 42. g4 b5 43. ab ab 44. Лc1 c2 45. Лd6 b4 46. Лb6 b3 47. Крe2 Крc3 48. Лg1 Cc4+ 49. Крe3 b2, 0:1.

Уладзіслаў Кавалёў — Мануэл Петрасян. 1. e4 e5 2. Kf3 Кc6 3. Cb5 Kf6 4. 0-0 K:e4 5. Лe1 Kd6 6. K:e5 Ce7 7. Cf1 Kf5 8. Kf3 0-0 9. d4 d5 10. c3 Cd6 11. Cd3 h6 12. Kbd2 Фf6 13. Kf1 Kce7 14. Ke5 Kg6 15. f4 c5 16. Ke3 K:e3 17. C:e3 c4 18. Cb1 Cf5 19. Фf3 Ke7 20. g4 C:b1 21. Ла:b1 Лad8 22. Лe2 C:e5 23. de Фa6 24. f5 Кc6 25. Cc5 Лfe8 26. e6 f6 27. Лbe1 d4 28. cd K:d4 29. C:d4 Л:d4 30. h3 Лe7 31. a3 Фd6 32. Крg2 Крh7 33. Лe4 Лd3 34. Л1e3 b5 35. h4 Лd2+ 36. Лe2 Лd3 37. Л4e3 Лd4 38. g5 Фd5 39. g6+ Крg8 40. Лe4 Лd3 41. Фf4 Фd6 42. Ф:d6 Л:d6 43. a4 a6 44. Л4e3 Лd5 45. ab ab 46. Лa3 Лe8 47. Лa7 Лc8 48. Лd7 Лdc5 49. e7, 1:0.

Сяргей Жыгалка фінішаваў на 76-м месцы (8 балаў з 15), Вячаслаў Зарубіцкі — на 167-м (6). У бліцы Сяргей Жыгалка заняў 48-е месца (12 балаў з 21), Уладзіслаў Кавалёў — 170-е (8,5), Вячаслаў Зарубіцкі — 192-е (8).

Сярод жанчын (122 удзельніцы) чэмпіёнкай у рапідзе стала Хумпі Канеру (Індыя), у бліцы — Кацярына Лагно (Расія). Беларуская шахматыстка Вольга Бадэлька заняла ў гэтых двух турнірах адпаведна 45-е (6,5 бала з 12 магчымых) і 89-е (7,5 з 17) месцы.

* * *

На турніры ў Рыме (72 удзельнікі) Мікіта Маёраў быў сёмы. Кірыл Ступак заняў восьмае месца на Кубку Казахстана ў Алматы. Рахіль Эйдэльсон была трэцяя ў Чалябінску. На «Кубку Паўночнага Захаду» ў Пецярбургу Віталь Цецераў фінішаваў сёмы, а ў турніры «В» таго ж спаборніцтва Ягор Філіпец быў чацвёрты.

* * *

Рашэнне задачы з мінулага выпуску: 1. Л:h3! Крd8 2. Ле3, 1...Крb8 2. Ла3 (блізня: 1. Кр:h3! з аналагічнай гульнёй ладдзі па другой гарызанталі). У задачы-«ёлцы», як паказвае просты аналіз, ход павінны рабіць чорныя, пасля чаго ў кожным з трох магчымых варыянтаў нескладана паставіць мат за 1 ход. Першыя правільна адказалі Васіль Жуковіч, Уладзімір Ізотаў, Сяргей Цяльпук, Віктар Жук. Задачу з пазамінулага выпуску правільна рашыў таксама Ігар Ананіч.

Вадзім ЖЫЛКО.

Сядзі і глядзі

Студзень. Час ладзіць прэм'еры

Адразу тры новыя праекты на тэлеканале «Беларусь 1» запрашаюць гледачоў на прэм'ернае спатканне ў гэтую суботу

Пошук сэнсу жыцця

На «першай кнопцы» 11 студзеня — першы выпуск новай праграмы «Сэнс жыцця». Яе вядучы Аляксандр Суцкавер запрашае ў госці вядомых артыстаў, спартсменаў, палітыкаў і распытвае іх пра тыя факты з жыцця, аб якіх яшчэ ніколі не гаварылі.

Аляксандр Суцкавер, вядомы шырокаму колу гледачоў у якасці тэлевядучага і акцёра тэатра і кіно (фільмы «Каменская», «У жніўні 44-га...», «Адліга»), будзе сустракаць сваіх суразмоўцаў у загарадным доме, каб у цёплай абстаноўцы паразмаўляць пра асабістае. У звыклым жанры вялікага інтэрв'ю, але ў неафіцыйным фармаце стваральнікі праграмы абяцаюць раскрыць публічных людзей з новага боку. Першым госцем стане народны артыст Беларусі, кавалер ордэна Францыска Скарыны, саліст легендарнага ансамбля «Сябры» Анатоль Ярмоленка, які раскажа ў «Сэнсе жыцця» пра сябе і сям'ю. А 18 снежня госцем праекта стане генеральны дырэктар Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы Павел Латушка.

За ўсіх разумнейшыя

Трэці сезон інтэлектуальнай гульні «Я ведаю!» на «Беларусь 1» распачнецца таксама 11 студзеня. Сумесны праект Белтэлерадыёкампаніі і Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь дае магчымасць вучням 5—11 класаў з усёй краіны праявіць сябе, прадэманстраваўшы свае веды ў розных галінах, ініцыятыўнасць і кемлівасць.

Што новага ў праекце? Павялічыўся хронаметраж выпускаў (да 52 эфірных хвілін цяпер дабавілі яшчэ 30 для інтэрактыву і размовы вядучых з гульцамі). А яшчэ змяніліся правілы гульні: цяпер стаць удзельнікам віктарыны можна толькі адзін раз за чатыры гады. Дарэчы, змянілася і месца здымак — яны праходзяць у адным з павільёнаў «Беларусьфільма». А вось вядучымі інтэлектуальнай гульні «Я ведаю!» па-ранейшаму засталіся Георгій Калдун, які агучвае школьнікам пытанні і шукае адказы на іх, і Дзмітрый Новік — ён падтрымлівае дзяцей у настаўніцкай разам з іх педагогамі.

Не прапусціце першы выпуск у суботу ў 13.30: зможаце пахварэць за сваіх, а разам з тым і праверыць або асвяжыць школьныя веды.

Дзень пачнецца ранкам

Жаночае ток-шоу «Дзень у вялікім горадзе» зменіць час трансляцыі — замест дзённага эфіру яно будзе выходзіць раніцай. Аўдыторыя таксама зможа ацаніць перазагрузку праграмы. Аўтары вырашылі змяніць дэкарацыі і па просьбе аўдыторыі разбавіць гадзіну эфіру інтэрактывам і розыгрышамі прызоў. Абноўленае ток-шоу глядзіце 14 студзеня на «Беларусь 1» у 10.40.

У эфір да дактароў

Яшчэ адной студзеньскай прэм'ерай стане праграма «Здорава здаровым быць» (яе стваральнікі вядомыя гледачам па праектах «Здароўе» і «Дзіцячы доктар»), яна папулярызуе здаровы спосаб жыцця і дасць адказы на самыя надзённыя пытанні: колькі трэба спаць, ці варта лячыць насмарк і многія іншыя, а таксама разбурыць распаўсюджаныя стэрэатыпы адносна здароўя.

Тэмы выпускаў праграмы фарміруюцца на аснове глядацкіх запытаў. У новым праекце парады дадуць найлепшыя ўрачы Беларусі — людзі, якія з уласнай практыкі ведаюць тое, што хвалюе ўсіх. Атрымаць тэлекансультацыю і абмеркаваць важныя для сябе тэмы можна наступным чынам: патэлефанаваць у рэдакцыю праграмы альбо запісацца на прыём у сацыяльных сетках і пры гэтым не забыцца прыхапіць у тэлеклініку гісторыю хваробы, каб урачы змаглі дакладна разабрацца ў сітуацыі.

У новага праекта чатыры пары вядучых, сярод якіх і медыйныя асобы, і непасрэдна ўрачы. Кансультаваць будуць такія спецыялісты, як педыятр, дэрматолаг, эндаваскулярны хірург і радыёлаг, прычым некаторым з іх даводзіцца прыязджаць на здымачную пляцоўку адразу пасля начных дзяжурстваў. А ў студыі адмыслова для праграмы сабралі мноства наглядных макетаў і стварылі тэматычныя лакацыі: офісную, абедзенную, дыягнастычны кабінет і нават прыёмны пакой псіхолага.

Алена ДРАПКО.
Фота Ганны ЗАНКАВІЧ і прэс-службы Белтэлерадыёкампаніі.

Беларусь 1

6.00 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00 (з сурдаперакладам), 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00 Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10, 18.15 «Зона Х» (16+).
7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
9.10 Галоўны эфір.
10.15 Навіны надвор'я.
10.40, 12.10, 18.35, 19.20 Меладрама «Прыгонная» (16+).
13.05, 17.05 Меладрама «Ноты кахання». 1—4-я серыі (16+).
15.10, 18.00 Навіны рэгіёна.
17.05 Беларуская часінка.
21.00 Панарама.
21.45 Арэна.
22.05 Камедыя «Навагодні перапалох» (12+).
23.25 «Новы год на Макаёнка, 9».
1.35 Дзень спорту.

Беларусь 2

7.00 «Уключайся!» (12+)
9.00, 18.40 Тэлебарометр.
9.05, 20.05 Серыял «Зразумець. Дараваць» (16+).
10.10 Капейка ў капейку (12+).
10.40 Камень, нажніцы, папера (16+).
11.15 «Да пабачэння!» (16+).
12.00 Прыгоды «Белы палон» (12+).
14.00 М/с «Чарапашкі-ніндзя» (12+).
15.05 Анімацыйны фільм «Ранг» (12+).
16.50 Баявік «Кідок кобры» (12+).
19.15 Суперлато.
21.10 Спортлато 6 з 49, КЕНО.
21.15 «Тата папаў» (16+).
23.25 «Хадзі сюды і танцуй».
23.30 «Арол і рэшка». Перазагрузка» (16+).
0.25 Серыял «Самара» (16+).

Беларусь 3

7.00 «Дабраранак».
7.35 «Беларуская кухня». Сала запечанае і параная капуста.
8.05, 12.00, 20.15 Навіны культуры.
8.25, 12.20, 20.35 Гэты дзень.
8.30 «Нацыянальны хіт-парад».
9.25, 16.55 «Калі можаш, даруй...» Маст. фільм (12+).
10.50 «Навукаманія» (6+).
11.15 «Сваімі словамі». Тэлевікторына.
12.25, 18.15 «Апошні дзень». Анатоль Кузняцоў (12+).
13.05, 18.55 «Каханая жанчына механіка Гаўрылава». Маст. фільм (12+) [СЦ].
14.20, 22.25 «Кіно маёй краіны». Частка шостая «Час надзей».
15.05, 21.05 «Братушка». Маст. фільм (12+).
16.25 «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+)
20.40 «Калыханка» (0+).
23.10 «Карагод у Новы год». Канцэртная праграма.

Беларусь 5

6.30, 12.30 Тэніс. WTA.
10.35 Вынікі тыдня.
11.20 Біятлон. Кубак свету. Аберхоф. Мас-старт. Жанчыны.
12.20 Азбука спорту.
14.30 Вялікі спорт.
15.15 Баскетбол. Адзіная ліга ВТБ. «Цмокі-Мінск» — «Аўтадар» (Саратаў).
17.05 Біятлон. Кубак свету. Аберхоф. Мас-старт. Мужчыны.
17.50 Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Металург» (Жлобін) — «Юнацтва-Мінск». (У перапынках — Спорт-цэнтр.)
20.10 Гандбол. Чэмпіянат Еўропы. Мужчыны. Чарнагорыя — Беларусь. (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
21.50 На шляху да «Токіа-2020». Відэачасопіс.
22.20 Гандбол. Чэмпіянат Еўропы. Мужчыны. Сербія — Харватыя. (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
0.00 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.

АНТ

6.00, 7.05, 8.05 «Наша раніца».
7.00 [СЦ], 8.00 [СЦ], 9.00 [СЦ], 11.00, 13.00, 16.00, 18.00 [СЦ], 20.30 Нашы навіны.
9.10 Контуры.
10.10 «Жыць здорава!» (16+)
11.10 Серыял «І ўсё-такі я кахаю...» (16+)
12.10 «Модны прыгавор» (6+).
13.10 Серыял «Карына Красная» (16+).
15.05 «Давай пажэнімся!» (16+)
16.20 «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
17.20, 18.20 «На самай справе» (16+).
18.50 «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
18.55 «Няхай гавораць» (16+).
20.00 Час.
21.10 Серыял «Пра Веру» (16+).
23.05 «Новы Новы год» (16+).
0.50 «Навагодняя ноч» (16+).

СТБ

6.00, 6.40, 7.45 «Раніца СТБ».
6.30 [СЦ], 7.30 [СЦ], 8.30 [СЦ], 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 Навіны «24 гадзіны».
8.40 «Тыдзень».
9.45 «Загадкі чалавецтва» (16+).
10.40 «Меч». Серыял (16+).
12.20, 15.35 «Вадзіць па-руску» (16+).
12.40, 0.45 «Самыя шакіруючыя гіпотэзы» (16+).
13.45, 20.30 «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
14.40 «Як устроены свет» (16+).
16.00, 16.50 «Маёр і магія». Серыял (16+).
20.00, 22.55 «СТБ-спорт».
20.05 «Сталічныя падрабязнасці».
20.15 «Міншчына».
21.20 «Наш 2019-ы».
23.00 «Навагодні праект «Кватэрнік».
1.30 «Мінтранс».

МІР

6.00, 10.10 Серыял «Вангелія» (12+).
10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.45 Навіны (бягучы радок).
13.15 «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
14.10 «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
15.05 «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
16.15, 19.25 Серыял «Вяртанне Мухтара-2» (16+).
19.55 «Гульня ў кіно» (12+).
20.50 «Начны экспрэс» (12+).
22.10, 0.00 Маст. фільм «Пасылка з Марса» (12+).
1.10 Маст. фільм «Ідэальнае Раство» (16+).
2.40 Серыял «Ганна Герман. Тайна белага анёла» (16+).

РТР—Беларусь

7.00 «Новая раніца».
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.25 «Пра самае галоўнае». Ток-шоу (12+).
12.20, 14.25 Маст. фільм «Час збіраць» (12+).
13.35 «Плюс-мінус». Надвор'е на тыдзень.
13.50, 16.50, 19.50, 23.00 Навіны — Беларусь.
15.00 Серыял «Тайны следства» (12+).
17.25 «60 хвілін». Ток-шоу.
18.35 «Андрэй Малахаў. Прамы эфір» (16+).
20.40 Серыял «Прыгонная» (12+).
23.10 Навагодні Блакітны агеньчык — 2020.

НТБ—Беларусь

6.10 «Астрапрагноз».
6.15 Спорт-мікс.
6.25 «50 рэцэптаў першага» (12+).
7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
7.10 «Здароўе» (12+).
8.20, 10.20 Серыял «ППС» (16+).
11.10 Серыял «Другі забойны» (16+).
13.25, 16.30 Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
14.00 Пракурорская праверка (16+).
15.00 Дэтэктыў «Чужы твар» (16+).
16.25, 19.40, 23.10 Сёння. Галоўнае.
17.10 Баявік «Марскія д'яблы. Смерч» (16+).
19.55 Дэтэктыў «Пёс» (16+).
20.55, 22.15 Серыял «Высокія стаўкі. Рэванш» (16+).
21.55 «НЗ.by».
23.25 Серыял «Участковы» (16+).

8 канал

7.00, 15.25, 18.55, 21.05, 0.30 «Надвор'е» + «Эрана».
7.10 М/с «Чып і Дэйл спяшаюцца на дапамогу».
7.35, 15.30 «Гумарынка».
7.40 Вестэрн «Легенда Зора» (6+).
9.50 Дэтэктыў «Рэнуар» (16+).
10.45 Дак. серыял «Кітайскі Новы год».
11.15 «Не толькі пра моду...»
11.45 Драма «Цуд» (12+).
13.35 Серыял «Містар Робат» (16+).
14.20 Серыял «Вялікая імператрыца» (12+).
15.35 «Мультпарад».
16.30 Серыял «Агент Мак Гайвер» (16+).
17.15 Меладрама «Лёгкія паводзіны» (16+).
19.00 Дэтэктыў «Рэнуар» (16+).
20.00 «Сакрэтныя матэрыялы».
20.50 «Вечарніца».
21.10 Драма «Доктар Жывага» (16+).

ВТБ

6.00, 7.15, 8.30, 10.55, 11.55, 14.55, 16.35, 18.10, 19.55, 23.20, 23.55 Прагноз надвор'я.
6.05 «Дурні і дарогі» (16+).
7.20 «Лаві момант» (16+).
8.35 «Наш рамонт» (16+).
9.15 «Ералаш» (6+).
9.45 М/ф «Тры каты» (0+).
10.05 М/ф «Качыныя гісторыі» (0+).
10.25 М/ф «Цімон і Пумба» (0+).
11.00 «Саранхэ» (16+).
12.00 Серыял «Шчаслівыя разам» (16+).
15.00 Фэнтэзі «Трус Пітэр» (6+).
16.40 Анімацыйны фільм «Воблачна, магчымы ападкі ў выглядзе фрыкадэлек» (12+).
18.15 Шоу «Форт Баярд» (16+).
20.00 «Уральскія пельмені» (16+).
21.20 Камедыя «Клік: з пультам па жыцці» (12+).
23.25 «КВЗ. Па-нашаму» (16+).
0.00 Серыял «Галыгін.ru» (16+).
1.25 «Уральскія пельмені». «Калі насы ў 12 б'юць» (16+).
2.40 Скетч-шоу «Даеш моладзь» (16+).
4.20 Скетч-шоу «6 кадраў» (16+).

Культура

6.30 «Лета Гасподняе». Святое Богаяўленне. Хрышчэнне Гасподняе [СЦ].
7.05 «Маўглі». Мультфільм.
8.45 «Я цябе ненавіджу». Маст. фільм [СЦ].
10.00 «Мы — грамацеі!»
10.45 «Звычайны канцэрт з Эдуардам Эфіравым».
11.10 «Зімовы вечар у Гаграх». Маст. фільм [СЦ].
12.40 «Пісьмы з правінцыі». Волагда [СЦ].
13.05 «Першыя ў свеце». Дак. серыял. «Арыфмометр Однера».
13.20, 0.40 «Вогненныя птушкі». Дак. фільм [СЦ].
14.00 «Іншыя Раманавы». «Яго Георгіеўскі крыж» [СЦ].
14.30 Ілюзіён. «Халасцяк». Маст. фільм.
16.00 XXVIII Цырымонія ўручэння Першай тэатральнай прэміі «Хрустальная Турандот».
17.10 «Пешшу...» Масква. Літаратурныя дамы [СЦ].
17.40 Да 75-годдзя Максіма Дунаеўскага. «Лінія жыцця» [СЦ].
18.35 «Рамантыка рамана». Максім Дунаеўскі.
19.30 Навіны культуры.
20.10 75 гадоў Вадзіму Абдрашытаву. «Слуга». Маст. фільм [СЦ].
22.25 Хібла Герзмава ў оперы Л. Керубіні «Медэя». Маскоўскі акадэмічны Музычны тэатр імя К. С. Станіслаўскага і У. І. Неміровіча-Данчанкі.
1.20 «Цудоўны Гоша», «Шэры воўк энд Чырвоная Шапачка». М/ф для дарослых.

Настальгія

6.00 «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1988-ы. 2-я частка (12+).
7.05 Фільм-канцэрт «Спявае Валерый Лявонцьеў». 1988 год (12+).
7.35 «Мы спяваем вершы...» 1985 год (12+).
9.00, 21.00, 3.00 «Мінулы час» (12+).
9.45, 11.00, 12.35, 20.35, 1.00, 3.45, 5.00 Музычная настальгія (12+).
10.00 «Колба часу» (16+).
12.00 «Да 16 і старэйшым...» 1991 год (16+).
12.45 «Вакол смеху» з Аляксандрам Івановым. Тэма: «Вучэнне». 1984 год (12+).
14.25 «Ранішняя пошта». 1986 год (12+).
15.00 «Быў час» (16+).
16.00 Маст. фільм «Машачка» (16+).
17.20 Канцэртная праграма «Госці з Сан-Рэма». 1992 год (12+).
18.00 «Гарадскія падрабязнасці». («Каханне з прывілеямі».) 1989 год (16+).
21.50 Фільм-канцэрт «Маскоўскі тэатр Сатыры на экране». 1970 год (12+).
